гаспадарчыя вынікі. Такіх загалоўкаў 34, з іх 15 – у няпоўным 1931 г. (да № 27 уключна). Напрыклад: “Рупна апрацуем нашы агароды”, “Павысім ураджайнасьць”, “Зьнішчым шкоднікаў у гародзе”, “Праз кааперацыю палепшым жывёлагадоўлю”, “Сваячасова падрыхтуемся да вясеньняй пасеўкампаніі”, “Поўнасьцю ачысьцім усё насеньне. Вапнаваньне глебы. Угнаеньне глебы торфам”, “Арганізуем працу ў калгасах”, “Пашырым гародніцтва ў калгасах”, “Вясновую сяўбу правядзем па-бальшавіцку. Пашырым пасеўную плошчу на 12%”, “Пашырым садоўніцтва”, “Арганізуем жаночую працу ў калгасах”, “Забясьпечым падкорм калгаснай жывёлы”, “Па-бальшавіцку правядзем уборачную кампанію”, “Добра падрыхтуемся да веснавой работы ў гародах”, “Арганізуем пашы для сьвіней”, “Даб’емся разгортваньня палітвыхаваўчай работы сярод калгасьніц і працоўных сялянак”, “Памножым рады ўдарніц”, “Шляхам сіласаваньня вырашым кармавую задачу”, “Наладзім работу ільнянога канвэеру. Забясьпечым бесьперапынны паток ільну ад поля да загатоўчага пункту”, “Сваячасова і поўнасьцю ўбярэм гародніну” і інш.

З канца 1920-х гадоў павялічваецца пафаснасць і лозунгавасць, заідэалагізаванасць загалоўкаў. У загалоўках ужываецца інфінітыў – нявызначаная форма дзеяслова – для павелічэння патэтыкі загалоўка за кошт таго, што інфінітыўная форма дзеяслова больш фармалізаваная, безасабовая, больш нагадвае лозунг (8 загалоўкаў). Напрыклад: “Халодны хлеў трэба пацепліць”, “Больш назапасіць гною”, “Узьняць актыўнасьць калгасьніц”, “Падрыхтаваць кваліфікаваных працаўнікоў для калгасаў”, “Ахаваць лён ад шкоднікаў”, “Поўнасьцю і сваячасова ўбраць і апрацаваць лён і канаплю” і інш. Ужо згаданы загаловак “Удзесецярыць тэмпы сяўбы – наша баявая задача”, прыклад таго, як адначасова выкарыстоўваюцца некалькі прыёмаў – і форма слова, і яго лексічнае значэнне.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У загалоўках 1930–1931 гг. выкарыстоўваецца такі прыём уздзеяння як пропуск дзеяслова і ў некаторых выпадках яго замена на працяжнік (7 загалоўкаў). Гэта надае загалоўкам эмацыянальнай рэзкасці. Напрыклад: “Уся ўвага першапачатковай апрацоўцы ільну ў калгасах”, “Арганізацыя працы – важнейшае пытаньне калгаснага будаўніцтва”, “Ніводнага калгасу і саўгасу бяз сіласу” і г.д.

У перыяд з 1929–1931 гг. сустракаюцца 8 загалоўкаў, якія маюць ваенныя матывы, якія прыўносяць параўнанне сельскагаспадарчай працы са змаганнем за Радзіму і адлюстроўваюцца ў словах – “барацьба”, “бой”, “паход”, “наперад” і г.д. Напрыклад: “Барацьба супроць шкоднікаў капусты”, “Коопэрацыйны актыў, у паход за колектывізацыю!”, “У бой з шкоднікамі”, “У бой за ажыццяўленьне адозвы ЦК КП(б)Б і СНК БССР”, “У першыя рады барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сяўбы і калектывізацыі”, “У паход за лён”, “Пад кіраўніцтвам КП(б)Б наперад за перавыкананьне баявых задач другой бальшавіцкай, наперад да новых баёў і перамог за справу суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю кулацтва як клясы” і г.д. Апошні прыклад з’яўляецца ілюстрацыяй таго, што ў 1931 г. загалоўкі канчаткова набываюць грувасткасць, фармалізаванасць, заідэалагізаванасць.

Уласна лозунгавая канструкцыя “за штосьці” сустракаецца ў загалоўках каля 7 разоў, найчасцей у 1931 г. Напрыклад: “За павялічаны ўраджай. (Рыхтуйцеся да сяўбы)”, “За буйную аграмаджаную сьвінагадоўлю”, “За ленінскі прызыў у калгасы”, “За выкананьне плянаў кантрактацыі пасеву ільну і канапель” і інш.

Звароты не былі распаўсюджаныя ў загалоўках, яны выкарыстоўваюцца ўсяго некалькі разоў – спачатку ў 1929 г. зварот “сялянка”, “сяляне”, у 1930 г.з’яўляецца зварот “калгасніцы” і ўжываецца толькі некалькі разоў у 1930–1931 гг. Напрыклад: “Сялянка, вывучы новы закон”, “Сяляне,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

пратручвайце насеньне ад галаўні", "Калгасьніцы – кармеце карову па нормах", "Батрачкі, калгасьніцы, сялянкі, не давайце разбазарваць жывёлу", а таксама не зварот, але намінацыя – "Савгасьніцы ў першыя рады па веснавой сяўбе".

Пры разглядзе дынамікі трансфармацыі загалоўкаў можна заўважыць, што паступова змяншаецца колькасць проста намінатыўных тэматычных загалоўкаў, а павялічваецца колькасць эмацыянальна нагружаных, ідэалагічных загалоўкаў.

Такім чынам, гісторыка-культурны агляд загалоўкаў сельскагаспадарчых матэрыялаў на старонках часопіса "Беларуская работніца і сялянка" ў 1924–1931 гг. дазваляе адзначыць ужытыя лексічныя, граматычныя, сэнсавыя асаблівасці мовы, якія адлюстроўваюць характэрныя рысы гістарычнага часу. Выяўляюцца агульныя прынцыпы канструявання загалоўкаў пад уплывам ідэалагічных, палітычных, псіхаэмацыянальных, сацыяльных і іншых фактараў уздзеяння на ўспрыманне чытачак. Асноўны акцэнт рабіўся на фарміраванні пачуцця калектыўнасці, супольнай адказнасці, энтузіязму пры выкананні дзяржаўных і партыйных задач, для чаго выкарыстоўваліся разнастайныя лінгвістычныя і псіхаэмацыянальныя спосабы ўздзеяння.

Таксама можна адзначыць працу рэдакцыі над лінгвістычнымі і сацыякультурнымі аспектамі даступнасці інфармацыі для сялянак, уплыву на іх псіхаэмацыянальны стан, трансляцыі дзяржаўнай ідэалогіі, фарміравання адмысловага светапогляду і пачуцця калектыўнасці. Перыяд 1924–1931 гг. можна разглядаць як час станаўлення часопіса, выпрацоўкі яго стылю, у тым ліку і падыходу да канструявання загалоўкаў [2, с. 130].

Такім чынам, выяўляецца, што загаловак матэрыялу ў перыядычным друку мае вялікае значэнне ў трансляцыі інфармацыі, яе даступнасці, мэтаскіраванасці, пажаданага ўздзеяння і інш. Дамінавалі дзве ключавыя функцыі загалоўкаў –

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

інфарматыўная (даступнасць, простасць, алгарытмічнасць, цікавасць) і ідэалагічная (экспрэсіўнасць, эмацыянальнае ўздзеянне, абуджэнне энтузіязму). Вывучэнне загалоўкаў сельскагаспадарчых матэрыялаў на старонках часопіса “Беларуская работніца і сялянка” ў 1924–1931 гг. дазваляе асэнсаваць дадатковыя сацыякультурныя, гістарычныя, лінгвістычныя асаблівасці свайго часу.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Беларуская работніца і сялянка : часопіс. – Мн. : Аддз. па працы сярод жанчын ЦК КП(б)Б, 1924–1931.

2. Меляшэвіч, Р. І. «Беларуская работніца і сялянка» – першае нацыянальнае выданне для жанчын / Р. І. Меляшэвіч // Веснік БДУ. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2005. – № 2. – С. 129–133.

3. Карбалевіч, Н. М. Сельскагаспадарчыя матэрыялы на старонках часопіса «Беларуская работніца і сялянка» (1924–1931) : агульны агляд / Н. М. Карбалевіч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2024. – Вып. 27. – С. 62–76.

4. Кутузова, С. Н. Сизов Иван Александрович / С. Н. Кутузова // Соратники Николая Ивановича Вавилова: исследователи генофонда растений / Федер. исслед. центр Всерос. ин-т генет. ресурсов растений (ВИР) ; редкол.: Н. И. Дзюбенко [и др.]. – 2-е изд., знач. перераб. и доп. – СПб., 2017. – С. 483–485.

5. Шакун, Л. М. «Беларуская граматыка для школ» Б. А. Тарашкевіча / Л. М. Шакун // Беларуская мова : энцыклапедыя / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 1994. – С. 81–82.

6. Германовіч, І. К. Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч / І. К. Германовіч // Беларуская мова : энцыклапедыя / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 1994. – С. 558–559.

7. Слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі : праект : [рас.-бел. слоўн.] / Ін-т бел. культуры, Аддз. мовы і літ., Ін-т навук. мовы. – Мн. : Ін-т бел. культуры, 1928. – 76 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 19).

8. Слоўнік тэрміналогіі агульнай раслінагадоўлі : праект : [рас.-бел. слоўн.] / Акад. наук БССР, Тэрмінал. каміс., Ін-т мовазнаўства. – Мн. : [б. в.], 1930. – 100 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 24).

9. Цярэнцьева, А. Ля вытокаў – рэвалюцыянеркі / А. Цярэнцьева // Алеся. – 2019. – № 4. – С. 6–9.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

References:

1. *Belarusian Woman Worker and Peasant Woman: magazine*. Minsk, Department for Work among Women of the Central Committee of the CP(b)B, 1924–1931. (in Belarusian).

2. Melyashevich R. I. “Belarusian Woman Worker and Peasant Woman” – the first national publication for women. *Vesnik BDU. Seryya 4, Filalogiya. Zhurnalistyka. Pedagogika* [Bulletin of the Belarusian State University. Series 4, Philology. Journalism. Pedagogy], 2005, no. 2, pp. 129–133 (in Belarusian).

3. Karbalevich N. M. Agricultural materials on the pages of the magazine “Belarusian Woman Worker and Peasant Woman” (1924–1931): general review. *Zdabytki: dakumental'nyya pomniki na Belarusi* [Achievements: documentary monuments in Belarus]. Minsk, 2024, iss. 27, pp. 62–76 (in Belarusian).

4. Kutuzova S. N. Sizov Ivan Aleksandrovich. *Associates of Nikolay Ivanovich Vavilov: researchers of the gene pool of plants. 2nd ed*. St. Petersburg, 2017, pp. 483–485 (in Russian).

5. Shakun L. M. “Belarusian Grammar for Schools” by B. A. Tarashkevich. *Belarusian language: encyclopedia*. Minsk, 1994, pp. 81–82 (in Belarusian).

6. Germanovich I. K. Tarashkevich Branislau Adamavich. *Belarusian language: encyclopedia*. Minsk, 1994, pp. 558–559 (in Belarusian).

7. *Dictionary of agricultural terminology: project*. *Belarusian Scientific Terminology. Issue 19*. Minsk, Institute of Belarusian Culture, 1928. 76 p. (in Belarusian).

8. *Dictionary of general plant cultivation terminology: project. Belarusian Scientific Terminology. Issue 24*. Minsk, 1930. 100 p. (in Belarusian).

9. Tsyarents'eva A. At the Origins – Women Revolutionaries. *Alesya*, 2019, no. 4, pp. 6–9 (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 13.10.2025
Received 13.10.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 811.161.3’282.2 (476.6)
https://doi.org/10.5281/zenodo.17597975

С. С. Масленікава

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь

АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ Ў ГАВОРКАХ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ З КАМПАНЕНТАМІ-ФІТОНІМАМІ, ЯКІЯ АБАЗНАЧАЮЦЬ АГАРОДНІНУ

Анатацыя. У артыкуле апісваюцца выяўленыя з самага актуальнага рэгіянальнага фразеалагічнага слоўніка Гродзеншчыны ўстойлівыя адзінкі з фітакампанентамі-назвамі агародніны. Аналізуецца іх колькасць і канатацыя.

Ключавыя словы: агародніна, гаворкі, канатацыя, фразеалагізм.

Для цытавання. Масленікава, С. С. Асаблівасці выкарыстання ў гаворках Гродзеншчыны фразеалагізмаў з кампанентамі-фітонімамі, якія абазначаюць агародніну / С. С. Масленікава // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 92–97.

С. С. Масленникова

Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, Гродно, Беларусь

ОСОБЕННОСТИ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ В ДИАЛЕКТЕ ГРОДНЕНЩИНЫ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ С КОМПОНЕНТАМИ-ФИТОНИМАМИ, ОБОЗНАЧАЮЩИМИ ОВОЩИ

Аннотация. В статье описываются выявленные из самого актуального регионального фразеологического словаря Гродненщины устойчивые единицы с фитокомпонентами-названиями овощей. Анализируется их количество и коннотация.

Ключевые слова: овощи, диалект, коннотация, фразеологизм.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Svetlana S. Maslennikova

Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus

THE FEATURES OF USING PHRASEOLOGICAL UNITS WITH PHYTONYM COMPONENTS DENOTING VEGETABLES IN THE DIALECT OF GRODNO REGION

Abstract. The article describes the stable units with phytocomponents-names of vegetables identified from the most actual regional phraseological dictionary of Grodno region. The number and connotation of these units are analyzed.

Keywords: vegetables, dialect, connotation, phraseological unit.

For citation. Maslennikova S. S. The features of using phraseological units with phytonym components denoting vegetables in the dialect of Grodno region. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 92–97 (in Belarusian).

Прырода – гэта натуральнае асяроддзе пражывання чалавека і невычэрпная крыніца яго жыццядзейнасці. Неад'емнай часткай прыроды з'яўляецца агародніна. Многія агародныя плады на працягу доўгіх стагоддзяў ужываюцца людзьмі ў ежу, могуць служыць фактарам адрозненняў і асаблівасцей многіх народаў, прама і ўскосна ўплываюць на жыццё чалавека і на яго маўленне. Назвы многіх агародных пладоў уваходзяць у склад устойлівых словалучэнняў – фразеалагізмаў. У артыкуле разглядаюцца мясцовыя фразеалагічныя адзінкі гаворак Гродзеншчыны з фітакампанентамі, якія абазначаюць назвы агародніны. Устойлівыя адзінкі былі знойдзены шляхам суцэльнай выбаркі з самага актуальнага рэгіянальнага фразеалагічнага слоўніка пад рэд. М. А. Даніловіча [1].

Нягледзячы на тое, што бульба займае адно з цэнтральных месцаў у беларускай нацыянальнай культуры, і яе нават называюць другім хлебам беларусаў, першае месца паводле частотнасці выкарыстання ў выяўленых фразеалагізмах Гродзеншчыны (15) займае фітакампанент ***гарох***: *боб з* ***гарохам*** *(змяшаць)* ‘розныя, несумяшчальныя рэчы (зблытаць, змяшаць)’; *галава* ***гарохавая*** няўхв. ‘бесталковы, неразумны чалавек’; *за*

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

каралём ***гарохавым*** жарт.-іран. ‘вельмі даўно, невядома калі’; *засыпаць троху* ***гароху*** ‘лёгка пакараць каго-небудзь’; *і* ***гарох*** *на языку (на языцы) спячэцца* іран. ‘хто-небудзь вельмі балбатлівы, не ўмее трымаць сакрэты’; *мяшаць (змяшаць, перамяшаць)* ***гарох*** *з капустай (капусту з* ***гарохам)*** няўхв. ‘сказаць без сэнсу, нелагічна’; *ні ў бабы* ***гарошку*** ‘1. нічога няма; 2. нічога не падрыхтавана, не зроблена’; *рукі* ***гарохавыя*** няўхв. ‘хто-небудзь не змог утрымаць у руках якую-небудзь рэч’; *чучала агароднае* ***(гарохавае)*** няўхв. ‘1. смешна, непрыгожа ці безгустоўна апрануты чалавек; 2. непрыгожы з выгляду, брыдкі чалавек’; *як* ***гарох*** *малаціць* ‘вельмі лёгка (рабіць што-небудзь)’; *як* ***гарох*** *прадаўшы (спаць)* ‘вельмі моцна’; *як* ***гарох*** *пры дарозе* ‘1. ненадзейна, неспакойна; 2. адзінока, без догляду’; *як (што) аб (у) сценку* ***гарохам***; *як у сценку* ***гарох***; *як (што)* ***гарохам (гарох)*** *аб сценку (аб сцену*) няўхв. ‘не дзейнічае, не даходзіць што-небудзь да каго-небудзь’.

Зразумела, што другое месца па частотнасці ўжывання ў складзе выяўленых фразеалагізмаў (11) займае кампанент-фітонім ***бульба*** (***картопля***): *вясною* ***бульбы*** *адкапаць* іран.-жарт. ‘ніколі не аддзячыць за што-небудзь’; *зімой* ***бульбу*** *адкапаць* жарт. ‘ніколі не адрабіць, не аддзячыць’; *Пярун стрэліць дык у* ***бульбу*** *не пападзе* жарт.-іран. ‘вельмі рэдкі (суп)’; *сабачая* ***бульба*** ‘труфель – клубнепадобны падземны грыб’; *таўкач на гнілыя* ***картоплі*** асудж. ‘някемлівы, бесталковы, ні на што не здатны чалавек’; *туман на* ***бульбу*** іран ‘чалавек, які падманвае, махляр’; *хоць у* ***бульбу*** *хавайся* ‘выказванне неспакою, трывогі, страху’; *як повар з* ***бульбай*** *(разабрацца)* жарт. ‘лёгка, хутка (разабрацца з кім-небудзь, з чым-небудзь)’; *як свіння ў* ***бульбу*** *(унадзіцца)* асудж. ‘рэгулярна, пастаянна (набыць звычку хадзіць куды-небудзь)’; *як туман па* ***бульбе*** *(хадзіць і пад.)* іран. ‘без справы, без толку (хадзіць)’; *яшчэ* ***бульба*** *не спяклася* ‘прайшло нямнога часу (як што-небудзь адбылося, зрабілася)’.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Дзевяць выяўленых фразеалагізмаў маюць у сваім складзе фітакампанент ***боб***: ***боб*** *з гарохам (змяшаць)* ‘розныя, несумяшчальныя рэчы (зблытаць, змяшаць)’; *жалезнага* ***бобу*** *пад’есці (з’есці, наесціся)* няўхв. ‘набрацца вялікага цярпення, мець незвычайную вытрымку’; *з* ***бобу*** *не гнаны (гультай)* асудж. ‘страшэнны (гультай)’; *зялёны (сыры)* ***боб*** *(мак) трэсці* няўхв. ‘моцна сварыцца, гневацца, лаяць, клясці каго-небудзь’; *на* ***бабах*** ‘1. (застацца) ні з чым; 2. нетрывалае, ненадзейнае што-небудзь’; *трах на* ***бабах*** ‘абы-як (зрабіць што-небудзь)’; *як* ***бобам*** *сыпаць* ‘хутка і шмат гаварыць’; *як* ***бобу*** *дзяцей* ‘вельмі шмат’.

У ходзе даследавання выяўлена сем мясцовых фразеалагізмаў з фітакампаненам ***рэпа***: *баба* ***рэпу*** *пасеяла на чым-небудзь* ‘1. у каго-небудзь парэпаныя (ногі); 2. у каго-небудзь вельмі брудныя (рукі, ногі, твар, вушы)’; *бусел* ***рэпу*** *пасеяў* (*пасее, сеяў*) ‘1. у каго-небудзь вельмі брудныя рукі, ногі, вушы, твар і пад.; 2. у каго-небудзь цыпкі на нагах)’; *буслава* ***рэпа*** ‘бат. раска’; *Пліска* ***рэпы*** *пасеяла* ‘парэпныя, брудныя (ногі, рукі)’; ***рэпу*** *пасеяць* ‘вельмі запэцкаць, забрудзіць (рукі, ногі, вушы)’; *хоць* ***рэпу*** *сей* ‘1. вельмі брудна (на нагах, на руках, на шыі); 2. вельмі брудныя (ногі, рукі, вушы)’; *як* ***рэпу*** *грызці (рэзаць)* ‘бойка, гладка, без запінкі’.

Таксама сем выяўленых устойлівых адзінак змяшчаць у сваім складзе фітакампанент ***хрэн***: *грушы* ***хрэнам*** *акалачваць* груб. ‘нічога не рабіць, гультаяваць’; ***хрэн*** *у вочы* ‘выказванне незадаволенасці, абурэння’; ***хрэн*** *у вочы дзяркач у зубы* ‘выказванне засцярогі ад уроку, ад нядобрага погляду’; ***хрэн*** *у зубы* груб. ‘зусім нічога. Пра адмову даць каму-небудзь, завалодаць чым-, кім-небудзь’; ***хрэна*** *з перцам* груб. ‘зусім нічога’; ***хрэна*** *смаляного дуба (атрымаць)* груб. ‘зусім нічога не (атрымаць)’; *як у латыша* ***хрэн*** *да душа* іран. ‘нічога няма ў каго-небудзь, хто-небудзь вельмі бедны’.

У мясцовых гаворках маюць месца шэсць фразеалагічных адзінак з фітакампанентам ***капуста***: *звер* ***капусны*** асудж. ‘злы, жорсткі чалавек’; *мяшаць (змяшаць, перамяшаць) гарох з*

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

капустай (капусту** з гарохам)* няўхв. ‘сказаць без сэнсу, нелагічна’; ***капусцяна** галава* няўхв. ‘неразумны, някемлівы чалавек’; *ссячы **капусту ‘зарабіць многа грошай’; *сшаткаваць на **капусту*** ‘моцна збіць каго-небудзь, расправіцца з кім-небудзь’; *як свіння ў **капусце** (разбірацца)* іран.-насмеш. ‘зусім не (разбірацца)’.

У трох выяўленых мясцовых фразеалагізмах сустракаецца фітакампанент ***гарбуз***: ***гарбуз** праглынуў* гумар. ‘з вялікім, тоўстым жыватом, пузаты’; ***гарбуза** з’есці* жарт. ‘зацяжарыць’; *як свіння **гарбуз** (запэцкаць і пад.)* няўхв. ‘вельмі моцна, да непазнавальнасці. Пра адзенне’.

У склад наступных выяўленых мясцовых фразеалагізмаў уваходзяць фітакампаненты:

***бурак:** аж **бурак** праз вушы лезе* іран.‘залішне многа, празмерна (напіцца)’; ***буракамі** адпалю (каму)* жарт. ‘аддам невядома калі, а можа і ніколі. Жартоўны адказ на пытанне, калі будзе аддадзена пазычанае’;

памідор:** прайшла любоў завялі **памідоры гумар. ‘хто-небудзь пастарэў, страціў жыццёвую актыўнасць’; *як свіння ў **памідорах** (разбірацца)* іран.-насмеш. ‘зусім не (разбірацца)’;

***рэдзька:** як горкая **рэдзька** (надакучыць, абрыдзець і пад.)* няўхв. ‘вельмі моцна, нязносна’; ***рэдзькі** з перцам* ‘зусім нічога (даць, узяць і пад. Часам суправаджаецца жэстам: указальны палец правай рукі аскрабае «рэдзьку» –указальны палец левай рукі)’;

цыбуля: *як кот **цыбулю** (любіць)* іран. ‘зусім не (любіць)’; *ні **цыбулінкі** ні ўкрышыць* ‘зусім нічога няма. Пра ежу’;

агурок:** як у бочцы з салёнымі **агуркамі ‘вельмі цесна дзе-небудзь’;

***радыска:** хоць **радыску** сей (на кім-небудзь)* ‘хто-небудзь вельмі брудны, запэцканы’;

кукуруза:** таўкач **кукрузны асудж. ‘някемлівы, бесталковы, ні на што не здатны чалавек’.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Значная колькасць выяўленых устойлівых адзінак з фітакампанентамі ***гарох*** (15), ***бульба*** (11), ***боб*** (8), ***рэпа*** (7), ***хрэн*** (7), ***капуста*** (6), ***гарбуз*** (3), ***бурак*** (2), ***памідор*** (2), ***рэдзька*** (2), ***цыбуля*** (2) ***агурок*** (1), ***радыска*** (1), ***кукуруза*** (1); іх здольнасць уступаць у дэрывацыйныя адносіны і ўтвараць новыя словы (*галава* ***гарохавая***; *за каралём* ***гарохавым***; *звер* ***капусны***; ***капусцяна*** галава; ні ***цыбулінкі*** *ні ўкрышыць*; *рукі* ***гарохавыя***; *таўкач* ***кукрузны***; *чучала агароднае (****гарохавае****)*); наяўнасць у некаторых фразеалагізмах яшчэ аднаго кампанента-фітоніма, які такама абазначае назвы агародніны (***боб*** *з* ***гарохам***; *мяшаць (змяшаць, перамяшаць)* ***гарох*** *з* ***капустай (капусту*** *з* ***гарохам)***), садавіны (***грушы хрэнам*** *акалачваць*), дрэў (***хрэна*** *смаляного* ***дуба***) сведчаць аб значнай ролі менавіта гэтых гатункаў агародніны, якія даступны мясцовым жыхарам, таму што ўсюды растуць на беларускай зямлі і не патрабуюць асаблівага догляду. Яны валодаюць харчовымі, лячэбнымі і прафілактычнымі ўласцівасцямі, іх ужыванне ў ежу чалавекам дапамагае яму заставацца здаровым.

Нягледзячы на значную ролю гатункаў агародніны для мясцовых жыхароў Гродзеншчыны 83% выяўленых рэгіянальных фразеалагізмаў маюць негатыўную афарбоўку. Яны сустракаюцца часцей, таму што дазваляюць ярчэй перадаць крытычныя адонсіны да з’яў.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Даніловіч, М. А. Фразеалагічны слоўнік гаворак Гродзеншчыны / М. А. Даніловіч. – Гродна : ГрДУ, 2020. – 607 с.

References:

1. Danilovich M. A. *Phraseological dictionary of the dialects of Grodno region.* Grodno, State University of Grodno, 2020. 607 p. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 14.09.2025
Received 14.09.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 81’373.44:638.1
https://doi.org/10.5281/zenodo.17598007

С. В. Мяньчэня

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ТЭРМІН “ЗЯМЕЦ” І СПРОБА ЎВЯДЗЕННЯ ЯГО З НАВУКОВЫ ЗВАРОТ

Анатацыя. Тэрмін “зямец”, які першапачаткова датычыўся аднаго з відаў пчалярскай дзейнасці, паступова стаў пазначаць усіх пчаляроў. Сам тэрмін можна аднесці да дыялектных слоў беларускай мовы, арэал яго распаўсюджвання ахоплівае Віцебшчыну і ўсходнюю Магілёўшчыну, а таксама некаторыя раёны Мінскай вобласці. Яго распаўсюджванню спрыяла фіксацыя ў слоўніках І. Насовіча і М. Гарэцкага, але канчаткова ў навуковы зварот для пазначэння пчалярскай дзейнасці ён не ўвайшоў па сукупнасці аб’ектыўных (рэгіянальны характар і цяжкасць успрымання) і суб’ектыўных фактараў (змены ў моўнай палітыцы і палітычныя працэсы 1930-х г.).

Ключавыя словы: пчалярства, слоўнікі, дыялектныя словы.

Для цытавання. Мяньчэня, С. В. Тэрмін “зямец” і спроба ўвядзення яго з навуковы зварот / С. В. Мяньчэня // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 98–107.

С. В. Меньченя

Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

ТЕРМИН «ЗЕМЕЦ» И ПОПЫТКА ЕГО ВВЕДЕНИЯ В НАУЧНЫЙ ОБОРОТ

Аннотация. Термин «земец», первоначально обозначавший один из видов пчеловодческой деятельности, постепенно стал обозначать всех пчеловодов. Сам термин относится к диалектным словам белорусского языка, ареал его распространения охватывает Витебщину и восточную часть Могилёвщины, а также некоторые районы Минской области. Распространению термина

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

способствовала фиксация в словарях И. Носовича и М. Горецкого, однако окончательно он не вошёл в научный оборот для обозначения пчеловодческой деятельности в силу совокупности объективных (региональный характер и сложность восприятия) и субъективных факторов (изменение языковой политики и политические процессы 1930-х годов).

Ключевые слова: пчеловодство, словари, диалектные слова.

Siarhiej V. Mianchenya

I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

THE TERM “ZIAMIETS” AND AN ATTEMPT TO INTRODUCE IT INTO SCIENTIFIC DISCOURSE

Abstract. The term “ziamiets”, which initially denoted one of the types of beekeeping activity, gradually came to refer to all beekeepers. The term itself refers to dialectal words of the Belarusian language, its area of distribution covers Vitebsk region and the eastern part of Mogilev region, as well as some districts of Minsk region. The spread of the term was facilitated by fixation in the dictionaries of I. Nosovich and M. Goretsky, however, it did not finally enter the scientific circulation to denote beekeeping activity due to a combination of objective (regional character and complexity of perception) and subjective factors (changes in language policy and political processes of the 1930s).

Key words: beekeeping, dictionaries, dialect words.

For citation. Mianchenya S. V. The term “ziamiets” and an attempt to introduce it into scientific discourse. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 98–107 (in Belarusian).

З абвяшчэннем курса на беларусізацыю распачалася маштабная праца па стварэнні і сістэматызацыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Асноўная задача пры гэтым бачылася ва ўвядзенні ў навуковы зварот менавіта беларускіх тэрмінаў, пазбаўленне ад “русізмаў” і “паланізмаў”. Створаная ў лютым 1921 г. Навукова-тэрміналагічная камісія, старшынёй якой быў абраны Сцяпан Некрашэвіч, арыентавалася на слоўнікі жывой беларускай гаворкі і літаратурныя творы, таму часам ўводзіла ў навуковы зварот дыялектныя словы і ўтварала неалагізмы.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Падобная сітуацыя ўзнікла з назвай традыцыйнага народнага промыслу – пчалярства.

Для яго пазначэння ў слоўніках таго часу найчасцей ужываецца тэрмін *“зямецтва”*, утвораны ад назоўніка *“зямец”* – пчаляр, які, у адрозненні ад бортніка, размяшчае вуллі на зямлі [1, с. 81]. У рускай мове тэрміну *“зямец”* найбольш адпавядае тэрмін *“пасечник”*. І зямец, і бортнік з’яўляюцца пчалярамі, тымі, хто займаецца пчоламі, адрозніваючыся толькі спосабам вядзення гаспадаркі. У той час як бортніцтва скарачалася, амаль усе пчаляры да пачатку XX ст. сталі зямцамі. Але калі выкарыстанне тэрміна *“пчаляр-зямец”* дазваляе ўдакладніць від дзейнасці, то тэрміны *“зямец”* і *“зямецтва”* не ўтрымліваюць нават падказкі, пра што ідзе гаворка. У першую чаргу ўзнікае асацыяцыя з зямлёй. Менавіта ў гэтым значэнні тэрмін *“зямец”* сустракаецца ў гістарычных крыніцах XVI – XVIII стст. Так, у “Гістарычным слоўніку беларускай мовы” прысутнічаюць два азначэнні: *1. Мясцовы жыхар, уладальнік невялікага зямельнага надзелу 2. Дэталь пабудовы* [2, с. 210]. У першым выпадку тэрмін *“зямец”* адпавядае *“зямяніну”*. Падобны варыянт можна знайсці і ў першай рэдакцыі “Толкового словаря живого великорусского языка” Ўладзіміра Даля: *“Зе́мец – землевладелец, у кого своя земля, кто пашет на себя, хотя и не свою землю, земский обыватель, отбывающий повинности”* [3, с. 609].

А вось з прывязкай да пчалярства тэрмін *“зямец”* ужываў Іван Насовіч. Займаючыся зборам матэрыялаў для слоўніка беларускай мовы, ён падрыхтаваў да друку 2500 беларускіх прымавак. У 1852 г. ён публікуе 100, а ў 1867 г. у “Записках Императорского Русского Географического Общества” поўны спіс. Сярод гэтых прымавак знаходзім і такую: “*Коли рой выйдзець перед св. Іваном, будець земец паном. Замечание занимающихся пчеловодством”* [4, с. 329]. У слоўніку І. Насовіча, які быў выдадзены ў 1870 г. прысутнічаюць словы *“земецкий – принадлежащий пчеловоду*” (у якасці прыкладу

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

пазначаны нож, пасудзіна і прыхамоць – адмысловыя ці чароўныя веды) і *“земéц – пчеловод”,* да яго даецца тлумачэнне, чым зямец адрозніваецца ад бортніка і два выразы: *“Земцы маюць прихомоць переманиваць к собе чужих пчол. Угадай земец, сколько миль до Вицепску?”* [5, с. 208]. Ці мае другі з іх прамое дачыненне да пчаляроў сказаць складана, але ён дазваляе лакалізаваць тэрмін *“зямец”*. Верагодна, што ён быў запісаны І. Насовічам недзе ў Віцебскай губерні. У асобным зборніку беларускіх прымавак 1874 г. зноў змяшчаецца прымаўка з выдання 1867 г., а ў невялічкім слоўніку тэрмін *“земéц – пчеловод”* [6, с. 65, 211].

Не без уплыву І. Насовіча тэрмін *“зямец”* з’яўляецца ў другім выданні слоўніка У. Даля ўжо ў іншым значэнні: *“**Земéц** – зап. пчеливец, пасечник, пчеловод. Коли рой выйдет перед Иваном (24 июня), будет земец паном. **Земчевать** заниматься пчеловодством бортевым или пасечным”* [7, с. 700–701]. Ранейшае значэнне тут адсутнічае, а сам тэрмін пазначаны прыналежным да заходнерускіх гаворак. Справа ў тым, што гэтае выданне рыхтавалі да друку ўжо пасля смерці У. Даля, яго дапоўнілі матэрыялы Якава Грота, Івана Навумава і Паўла Шэйна. Менавіта апошні і мог з’яўляцца аўтарам пазначанага новаўвядзення, ён безумоўна быў знаёмы з вынікамі працы І. Насовіча, ды і сам збіраў этнаграфічны матэрыял і працаваў у Віцебскай гімназіі. Адметным з’яўляецца выкарыстанне дзеяслова *“земчевать”*, які ў І. Насовіча не сустракаецца, а таксама пашырэнне яго на ўсю пчалярскую дзейнасць, у тым ліку і на бортніцтва.

Аб тым, што тэрмін *“зямец”* меў рэгіянальны характар, сведчаць наступныя факты. Па-першае, яго не ўжывалі беларускія пісьменнікі і грамадскія дзеячы, якія паходзілі з цэнтральнай ці заходняй Беларусі (Якуб Колас, Янка Купала, Вацлаў Ластоўскі). У “Нашай Ніве” сустракаецца толькі паняцце *“зéмец”* – земскі службовец, служачы земскай установы

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

[8, с. 248]. У слоўніку В. Ластоўскага ўжываюцца словы *“пшчаляр”* і *“пшчальніцтва”,* пры гэтым аўтар карыстаўся ў сваёй рабоце матэрыяламі І. Насовіча і слоўнікам У. Даля, а менавіта яго другім выданнем, але не палічыў магчымым ужыць тэрмін *“зямец”* [9, с. 579, 831]. Па-другое, актыўна ўжывалі яго якраз ураджэнцы ўсходняй Беларусі, а найбольш актыўна Максім Гарэцкі. Адметна, што ў сваіх беларуска-рускіх слоўніках ён ужывае толькі тэрміны *“зямец”* і *“зямецтва”* [10, с. 112; 11, с. 72], а вось у руска-беларускім слоўніку, падрыхтаваным ў сааўтарстве з братам Гаўрылам Гарэцкім, прысутнічаюць варыянты *“зямецтва”* і *“пчалярства”* [12, с. 74]. Прысутнічае тэрмін *“зямец”* і ў літаратурнай спадчыне М. Гарэцкага, напрыклад, у апавяданні “Багатая пчэльня” (1921 г.) галоўным героям якога з’яўляецца “адзін заможны зямец” [13, с. 292].

У “Беларуска-расійскім слоўніку” Сцяпана Некрашэвіча і Міколы Байкова, які з’яўляўся адным з найбольш грунтоўных выдынняў 1920-х г., як і ў слоўніку братоў Гарэцкіх, ужываюцца варыянты *“зямецтва”* і *“пчалярства”* [14, с. 136, 264]. А вось “Расійска-беларускі слоўнік” 1928 г. тых жа аўтараў перакладае на беларускую мову *“пчеловодство”* як *“зямецтва, бортніцтва, пчалярства, пчальні́цтва”* [15, с. 502]. Шматварыятыўнасць у гэтым выпадку працавала не на карысць тэрміна “зямец”, як складанага да ўспрымання з-за адсутнасці прамой аналогіі з тым, што ён азначаў.

Згортванне палітыкі беларусізацыі і палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. XX ст. прывялі да таго, што многія беларускія слоўнікі апынуліся ў спецфондах, а іх аўтары былі асуджаны як “ворагі народа”, ды і распрацоўка асобнай беларускай тэрміналогіі згубіла актуальнасць. Ва ўмовах, калі беларускі правапіс і лексіку, імкнуліся наблізіць да рускай, у рэдкіх слоў шансаў застацца ў новых выданнях слоўнікаў не было. У перакладных слоўніках 30–80 гг. слова “зямец” не зафіксавана [1, с. 81].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Разам з гэтым яно фіксуецца ў слоўніках мясцовых гаворак і выданнях, прысвечаных традыцыйным народным промыслам. Згодна з імі можна вызначыць арэал яго распаўсюджвання. Так, у выдадзеным у 1927 г. “Віцебскім краёвым слоўніку” Мікалая Каспяровіча ёсць спасылка на в. Латыгаль на Сенненшчыне: “Ён дужа добры зямец, у яго і мёду дастанеш” [16, с. 139]. У “Слоўніку Сеннешчыны” (2013 г.) сустракаем наступны выраз: *“Ён прыродны пчылавот – зямец”* [17, с. 212]. “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” фіксуе выраз *“Мой зяць зямцом цяперака ў калхозе”* у Міерскім раёне [18, с. 216]. Іван Бялькевіч, які збіраў свае матэрыялы у 1920-я г., пазначае Касцюковіцкі, Краснапольскі, Чэрыкаўскі і Клімавіцкі раён Магілёўскай вобласці: *“Ну і які з цябе зямец, калі пчолы ў цябе ніяк не вядуцца?”* [19, с. 213]. У “Слоўніку беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча” пазначаюцца прыклады ўжывання тэрміну “зямец” у Вілейскім, Докшыцкім, Крупскім і Чэрвеньскім раёне: *“Мой дзед быў зямец: і ліжакі, і стаякі ў яго былі (Беразіно, Докшыцкі раён)*” [20, с. 336]. М. Макарэвіч да вышэй пералічаных лакацый дадае яшчэ і Слаўгарадскі раён: *“Ён добры зямец, у яго яшчэ да вайны пчолы былі”* [21, с. 57].

Такім чынам, тэрмін *“зямец”*, які першапачаткова датычыўся аднаго з відаў пчалярскай дзейнасці, паступова, са знікненнем бортніцтва, стаў пазначаць усіх пчаляроў. Сам тэрмін можна аднесці да дыялектных слоў беларускай мовы, арэал яго распаўсюджвання ахоплівае Віцебшчыну і ўсходнюю Магілёўшчыну, а таксама некаторыя раёны Мінскай вобласці. Яго распаўсюджванню спрыяла фіксацыя ў слоўніках І. Насовіча і М. Гарэцкага, але канчаткова ў навуковы зварот для пазначэння пчалярскай дзейнасці ён не ўвайшоў па сукупнасці аб’ектыўных (рэгіянальны характар і цяжкасць успрымання) і суб’ектыўных фактараў (змены ў моўнай палітыцы і палітычныя працэсы 1930-х г.).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Губкіна, А. В. Лексікалогія і лексікаграфія беларускай мовы XX ст.: сацыялінгвістычны аспект / А. В. Губкіна. – Мн. : БДУ, 2012. – 143 с.

2. Гістарычны слоўнік беларускай мовы : у 37 вып. Вып. 12 / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; гал. рэд. А. І. Жураўскі. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 286 с.

3. Даль, В. И. Толковый словарь живаго великорускаго языка = Толковый словарь живого великорусского языка : [в 4 ч.] / [соч.] В. И. Даля. – М. : О-во любителей Рос. словесности при Императ. Моск. ун-те, 1863. – Ч. 1. – 627 с.

4. Записки Императорского Русского Географического Общества по Отделению этнографии. – СПб., 1867. – Т. 1. – 754 с.

5. Словарь белорусского наречия / сост. И. И. Носовичем. – СПб. : Тип. Императ. Акад. Наук, 1870. – 756 с.

6. Сборник белорусских пословиц составленный И. И. Носовичем. – СПб. : Тип. Императ. Акад. Наук, 1874. – VI, 232, 17 с. – (Сборник Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук ; т. 12, № 2).

7. Даль, В. И. Толковый словарь живаго великорускаго языка = Толковый словарь живого великорусского языка : [в 4 т.] / [соч.] В. И. Даля. – 2-е изд., испр. – СПб. ; М. : Тип. М. О. Вольфа, 1880. – Т. 1. – 723 с.

8. Слоўнік мовы «Нашай Нівы», 1906–1915 : у 5 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мн. : Тэхналогія, 2007. – Т. 2. – 624 с.

9. Ластоўскі, В. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік / В. Ластоўскі. – Коўна : Друк. А. Бака, 1924. – 833 с.

10. Гарэцкі, М. Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік / М. Гарэцкі ; пад рэд. Я. Станкеўчыка. – Вільня : Крыніца, 1919. – 264 с.

11. Гарэцкі, М. Беларуска-расійскі слоўнічак / М. Гарэцкі. – Вып. 3-е. – Мн. : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 175 с.

12. Маскоўска-беларускі слоўнік / браты М. і Г. Гарэцкія. – Выд. 2-е, (з папр. і вялікімі дадад.). – Вільня : Выд-ва У. Знамяроўскага, 1920. – V, 144 с.

13. Гарэцкі М. Багатая пчэльня / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мн., 1984. – Т. 1 : Апавяданні, 1913–1930 / рэд. С. А. Андраюк. – С. 292–295.

14. Байкоў, М. Беларуска-расійскі слоўнік / М. Байкоў, С. Некрашэвіч. – Мн. : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 356 с.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

15. Байкоў, М. Расійска-беларускі слоўнік / М. Байкоў, С. Некрашэвіч. – Мн. : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1928. – 728 с.

16. Каспяровіч, М. Віцебскі краёвы слоўнік : (матэрыялы) / М. Каспяровіч. – Выд. 2-е, стэр. – Мн. : [б. в.], 2011. – XIX, 371, [6] с.

17. Слоўнік Сенненшчыны : у 3 т. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. бел. культ., мовы і літ-ры, Філ. «Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы» ; уклад.: Н. М. Бунько [і інш.] ; навук. рэд.: В. М. Курцова, Л. П. Кунцэвіч. – Мн. : Бел. навука, 2013. – Т. 1. – 278 с.

18. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны : у 2 ч. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэд. Л. І. Злобін ; склад.: Л. І. Злобін [і інш.]. – Віцебск : ВДУ, 2012. – Ч. 1. – 304 с.

19. Бялькевіч, І. К. Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны / І. К. Бялькевіч ; рэд.: М. В. Бірыла, А. А. Крывіцкі. – Мн. : Навука і тэхніка, 1970. – 511 с.

20. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; уклад.: Ю. Ф. Мацкевіч [і інш.] ; рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мн. : Навука і тэхніка, 1980. – Т. 2. – 728 с.

21. Макарэвіч, М. М. Слоўнік народных промыслаў і рамёстваў Беларусі / М. М. Макарэвіч ; пад. рэд. М. Р. Прыгодзіча. – Мн. : Права і эканоміка, 2010. – 130 с.

References:

1. Gubkina A. V. *Lexicology and lexicography of the Belarusian language of the 20th century: sociolinguistic aspect*. Minsk, Belarusian State University, 2012. 143 p. (in Belarusian).

2. Zhurauskii A. I. (ed.). *Historical dictionary of the Belarusian language: in 37 issues. Iss. 12*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1993. 286 p. (in Belarusian).

3. Dal V. I. *Explanatory dictionary of the living great Russian language by V. I. Dahl: in 4 parts. Part 1*. Moscow, Society of Amateurs of Russian Literature at the Imperial Moscow University, 1863. 627 p. (in Russian).

4. *Notes of the Imperial Russian Geographical Society in the Department of Ethnography. Vol. 1*. St. Petersburg, 1867. 754 p. (in Russian).

5. Nosovich I. I. (comp.). *The dictionary of the Belarusian local tongue*. St. Petersburg, Printing House of the Imperial Academy of Sciences, 1870. 756 p. (in Russian).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

6. Nosovich I. I. (comp.). *Collection of Belarusian proverbs. Collection of the Department of Russian Language and Literature of the Imperial Academy of Sciences. Vol. 12, no. 2*. St. Petersburg, Printing House of the Imperial Academy of Sciences, 1874. VI, 232, 17 p. (in Russian).

7. Dal V. I. *Explanatory dictionary of the living great Russian language by V. I. Dahl: in 4 volumes. Vol. 1*. 2nd ed. St. Petersburg; Moscow, M. O. Wolf Publ., 1880. 723 p. (in Russian).

8. Lemtsyugova V. P. (ed.). *Dictionary of the language of "Nasha Niva" ["Our Field"], 1906–1915: in 5 volumes. Vol. 2.* Minsk, Tekhnalogiya Publ., 2007. 624 p. (in Belarusian).

9. Lastouski V. *Concise Russian-Krivich (Belarusian) dictionary*. Kaunas, A. Bak Publ., 1924. 833 p. (in Belarusian).

10. Garetski M. *Small Belarusian-Moscow dictionary*. Vilnius, Krynitsa Publ., 1919. 264 p. (in Belarusian).

11. Garetski M. *Belarusian-Russian dictionary*. 3rd. ed. Minsk, State Publishing House of Belarus, 1925. 175 p. (in Belarusian).

12. Garetski M., Garetski G. *Moscow-Belarusian dictionary*. 2nd ed. Vilnius, U. Znamyarouski Publ., 1920. V, 144 p. (in Belarusian).

13. Garetski M. Rich apiary. *Collection of works: in 4 volumes. Vol. 1*. *Stories, 1913–1930*. Minsk, 1984, pp. 292–295 (in Belarusian).

14. Baikou M., Nekrashevich S. *Belarusian-Russian dictionary*. Minsk, State Publishing House of Belarus, 1925. 356 p. (in Belarusian).

15. Baikou M., Nekrashevich S. *Russian-Belarusian dictionary*. Minsk, State Publishing House of Belarus, 1928. 728 p. (in Belarusian).

16. Kaspyarovich M. *Vitebsk regional dictionary: (materials)*. 2nd ed. Minsk, 2011. XIX, 371, [6] p. (in Belarusian).

17. Kurtsova V. M., Kuntsevich L. P. (eds.). *Dictionary of Sennenshchyna: in 3 volumes. Vol. 1*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2013. 278 p. (in Belarusian).

18. Zlobin L. I. (ed.). *Regional dictionary of Vitebsk region: in 2 parts. Part 1*. Vitebsk, Vitebsk State University, 2012. 304 p. (in Belarusian).

19. Byal'kevich I. K. *Regional dictionary of the eastern Mogilev region*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1970. 511 p. (in Belarusian).

20. Matskevich Yu. F. (ed.). *Dictionary of Belarusian dialects of northwestern Belarus and its border region: in 5 volumes. Vol. 2*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1980. 728 p. (in Belarusian).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

21. Makarevich M. M. *Dictionary of folk arts and crafts of Belarus*. Minsk, Prava i ekanomika Publ., 2010. 130 p. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 05.10.2025
Received 05.10.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 376-056.263+81’221.24
https://doi.org/10.5281/zenodo.17598038

Т. Г. Трофимович, И. К. Русакович

Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка, Минск, Беларусь

ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ СЛОВЕСНОГО И ЖЕСТОВОГО ЯЗЫКОВ ПРИ ОСВОЕНИИ ШКОЛЬНИКАМИ С НАРУШЕНИЕМ СЛУХА СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЙ ТЕРМИНОЛОГИИ

Аннотация. В докладе рассматриваются проблемы взаимодействия словесного и жестового языков в процессе обучения школьников с нарушением слуха, усвоение ими сельскохозяйственной терминологии. Авторы рассматКоривают особенности формирования естественнонаучных понятий, развитие и обогащение жестовой речи.

Ключевые слова: словесный язык, жестовый язык, потеря слуха, единицы жестового языка, формирование понятия, взаимодействие языков.

Для цитирования. Трофимович, Т. Г. Взаимодействие словесного и жестового языков при освоении школьниками с нарушением слуха сельскохозяйственной терминологии / Т. Г. Трофимович, И. К. Русакович // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 108–119.

Т. Г. Трафімовіч, І. К. Русаковіч

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ СЛОЎНАЙ І ЖЭСТАВАЙ МОЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ШКОЛЬНІКАМІ З ПАРУШЭННЕМ СЛЫХУ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Анатацыя. У дакладзе разглядаюцца праблемы ўзаемадзеяння слоўнай і жэставай моў у працэсе навучання школьнікаў з парушэннем слыху, засваенне імі сельскагаспадарчай тэрміналогіі. Аўтары разглядаюць асаблівасці фарміравання прыродазнаўчых паняццяў, развіццё і ўзбагачэнне жэставай гаворкі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Ключавыя словы: слоўная мова, мова жэстаў, страта слыху, адзінкі мовы жэстаў, фарміраванне паняцця, узаемадзеянне моў.

Tamara G. Trofimovich, Irina K. Rusakovich

Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus

INTERACTION OF VERBAL AND SIGN LANGUAGES WHEN SCHOOLCHILDREN WITH HEARING IMPAIRMENT LEARN AGRICULTURAL TERMINOLOGY

Annotation. The paper discusses the problems of interaction of verbal and sign languages in the process of teaching schoolchildren with hearing impairment, their mastering of agricultural terminology. The authors consider the features of the formation of natural science concepts, the development and enrichment of sign language.

Keywords: verbal language, sign language, hearing loss, sign language units, concept formation, language interaction.

For citation. Trofimovich T. G., Rusakovich I. K. Interaction of verbal and sign languages when schoolchildren with hearing impairment learn agricultural terminology. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 108–119 (in Russian).

По данным Всемирной организации здравоохранения около 5% населения мира страдает нарушением слуха. Сообщается также, что в Республике Беларусь около десяти тысяч таких лиц, из которых две тысячи детей [1]. Основной формой их общения является жестовый язык, который в последние годы все чаще называют белорусским жестовым языком. Это не переведенный на жесты словесный язык, а сформированная в определенных социокультурных условиях знаковая система.

Статья 10 действующего в нашей стране закона «О правах инвалидов и их социальной интеграции», принятого Палатой представителей 31 мая 2022 года, напрямую указывает, что «для инвалидов с нарушением слуха в качестве средств общения используются … средства визуализации информации в процессе общения (субтитрирование, письменная речь, перевод на

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

жестовый язык)». В статье 11 конкретизируется роль национального жестового языка в образовании неслышащих учащихся: «Государством признается языковая самобытность социокультурного (культурно-лингвистического) сообщества инвалидов с нарушением слуха. Жестовый язык признается языком общения инвалидов с нарушением слуха, в том числе в сферах устного использования государственных языков Республики Беларусь, является полноценной лингвистической языковой системой познания, развития, образования, обеспечения доступа к информации» [2].

Образовательная политика также легализует целенаправленное формирование учебных понятий, терминологии и компетенций лиц с нарушением слуха в условиях комплексирования словесной и жестовой речи в обучении. Основным средством обучения выступает словесный язык, а жестовый – дополнительным, вспомогательным на общеобразовательных уроках и основным на уроках жестового языка и коррекционных занятиях по развитию жестовой речи. Так, в Кодексе об образовании Республики Беларусь (2011) прописано: «Образовательный процесс при реализации образовательных программ специального образования для обучающихся с нарушением слуха (неслышащие и слабослышащие с потерей слуха в пределах 70–90 децибел) организуется на белорусском или русском (письменная, устная, дактильная формы) и жестовом языках» (ст. 268, п. 20) [3].

Согласно учебному плану специального образования, неслышащие учащиеся получают цензовое образование в специальных школах, где, как и в общеобразовательных школах, изучается весь цикл естественно-научных дисциплин, начиная с уроков «Человек и мир» (1–5 классы), и далее – на уроках биологии и географии. На коррекционных занятиях по развитию устной речи, жестовой речи, развитию слухового восприятия, социальному ориентированию весь речевой материал уроков,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

включая природоведческий, становится основой для формирования компенсаторных механизмов, развития остаточного слуха, навыков чтения с губ, произносительных и коммуникативных умений и т.д. [4].

Практика современного обучения школьников с нарушением или потерей слуха подразумевает контактирование и взаимодействие словесного и жестового языков. Она опирается на теоретические положения отечественных и зарубежных ученых (Т. А. Григорьева, Г. Л. Зайцева, Т. Г. Богданова и др.) о положительной роли жестового языка в эмоционально-познавательном, социальном, коммуникативном развитии личности в условиях слуховой депривации [5], в том числе и о его важном значении для формирования правильных связей и отношений в цепочке «жест – смысл – слово» [6].

Сельскохозяйственная и естественнонаучная терминология на первой ступени общего среднего образования активно используется в процессе преподавания учебной дисциплины «Человек и мир». Действующие программы для 1–5 классов специальных школ включают в себя природоведческие разделы по временам года «Осень. Зима. Весна. Лето», в которых закладываются основы формирования терминологической лексики – например, в темах «Погода осенью» (С. 29) «Разнообразие растений» (С. 32), «Растения огорода» (С. 40)», «Листопад» (С. 46), «Растения весной» (С. 127), «Труд людей весной» (С. 135), «Растения летом» (С. 160). Учитывая большие трудности формирования словесной речи неслышащих детей (всех ее сторон – произносительной, лексико-грамматической, понятийной), объем изучаемого материала в первом классе небольшой. В это время закладываются основы – создаются условия для запоминания слов-обозначений и обобщающих понятий *растения, кустарники, деревья* (С. 33), *листья, ветви, стебель*, глагольной лексики – *растут, вырастают, созревают*, их предикатов *большой, маленький, толстый, тонкий* (С. 36).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Впервые на страницах учебника появляются основные, знакомые детям продукты, связанные с сельским хозяйством: груша, *яблоня, слива, вишня* (С. 37), *черная смородина, красная смородина, малина, крыжовник* (С. 38), *свекла, морковь, капуста, картофель, помидор, огурец* (С. 41) и т.д. [8].

For citation. Hlushytski L. U. Features of Translating Terms of the AGROVOC Multilingual Thesaurus of the Food and Agriculture Organization of the United Nations into Closely Related Languages. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 137–146 (in Belarusian).

Дзяржаўныя мовы Беларусі – блізкароднасныя, і гэты фактар можа як спрашчаць, так і ўскладняць працу перакладчыка з замежнай мовы. У гэтым дакладзе мы хочам звярнуць увагу на тыя адрозненні паміж беларускімі і рускімі эквівалентамі, улік

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

якіх адыгрывае значную ролю ў дасягненні высокай якасці перакладу. Прыклады, якія прыводзяцца ў дакладзе, узяты аўтарам з уласных перакладаў, выкананых у межах працы над беларускай часткай Шматмоўнага тэзаўруса Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі Аб'яднаных Нацый AGROVOC [1].

Перакладаючы з англійскай мовы, у пэўных выпадках можна сутыкнуцца з тым, што беларускі і рускі эквіваленты блізкія паміж сабой або нават вонкава ідэнтычныя. Гэта можна праілюстраваць такімі прыкладамі, як *pain – боль – боль*[1]; *shock – шок – шок*; *flight – палёт – полёт*; *collapse – калапс – коллапс*; *hydrochloric acid – саляная кіслата – соляная кислота* і інш.

Аднак гэта не павінна ўводзіць перакладчыка і даследчыка ў зман адносна прастаты перакладу з англійскай мовы пры дапамозе рускай. Сапраўды, бачачы такія выпадкі, можна ўспрыняць рускамоўны варыянт (пры яго наяўнасці) як добрую падказку пры перакладзе і ў выніку падаць блізкі да рускага па гучанні і форме адпаведнік.

Тым не менш відавочна, што такі падыход у вялікай колькасці выпадкаў прыводзіць да машынальнага перакладу, недапушчальнага спрашчэння задач перакладчыка і няправільных, штучных калек у беларускай частцы. Ніжэй будуць прыведзены разнастайныя выпадкі, у якіх механічнае прытрымліванне рускіх варыянтаў пры перакладзе магло б нашкодзіць якаснаму выкананню ўскладзенай на перакладчыка працы.

Сярод розных тыпаў адрозненняў перакладаў можна назваць выпадкі, калі ў рускай частцы пададзена запазычанне, але ў беларускай частцы сэнс арыгінальнага тэрміна мэтазгодна перадаць з дапамогай слоў з беларускімі каранямі. Гэта

[1]Тут і далей прыклады эквівалентных адзінак даюцца ў паслядоўнасці англ. – бел. – рус. – Л. Г.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

наступныя тэрміны: *acceleration – паскарэнне – акселерация* (у гэтым выпадку як аргумент можна прывесці і нямецкі тэрмін *Beschleunigung*: як бачым, нямецкія перакладчыкі таксама падалі слова з уласных каранёў, а не сталі запазычваць *acceleration*); *ratoons – парастак – ратуны*; *siblings – дзеці адных бацькоў – сиблинги.*

Апошні выпадак, на нашу думку, вельмі выразна паказвае, што не заўсёды можна дзеля дакладнасці ісці на запазычванне. Слова *siblings (сіблінгі)* – выразна небеларускае (зрэшты, і выразна нярускае). Аўтары «Англійска-беларускага слоўніка» (2013) адназначна перакладаюць *siblings* як *дзеці адных бацькоў* [2, с. 560]. І тут трэба з імі пагадзіцца, паколькі запазычанне было б нязвыклым па гучанні і ўвогуле малазразумелым для шырокіх слаёў насельніцтва нашай краіны.

Блізкі да гэтага тыпу выпадак – пераклад тэрміна *elderly nutrition*. У нашай версіі гэтыя адпаведнікі выглядаюць наступным чынам: *elderly nutrition – харчаванне пажылых людзей – геродиетическое питание.* Сітуацыя цікавая тым, што рускі варыянт не запазычаны з англійскай мовы, але пры гэтым усё роўна далёкі ад рускіх народных слоў. Рускі тэрмін паходзіць ад старажытнагрэчаскага *γέρων* (‘стары (прым.)’, ‘стары (наз.)’, ‘старшы’[1] [3, т. 1, с. 320]). Наўрад ці гэты тэрмін больш блізкі для сучаснага карыстальніка і навукоўца (як беларускага, так і рускага), чым словы з коранем *-стар-*.

Тым не менш у нашых перакладах сустракаюцца і адваротныя выпадкі. Гэта значыць, такія, калі ў беларускай версіі ўжыты запазычаны корань, хоць у рускай бачым выбар на карысць свайго слова. У якасці прыкладу можна прывесці такія радкі адпаведнікаў: *abrasion resistance – устойлівасць да абразіі – устойчивость к истиранию*; *genotyping – генатыпаванне – генетическая паспортизация*.

[1]Таксама гэта слова мела значэнне ‘старэйшына’.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У першым выпадку наш выбар абумоўлены тым, што слова *абразія* ўжо даўно фіксуецца слоўнікамі беларускай мовы, у тым ліку англійска-беларускімі. У «Слоўніку іншамоўных слоў» (1999) А. М. Булыкі мы знаходзім лексему *абразія* ажно ў двух значэннях, што сведчыць пра ўжывальнасць гэтага слова [4, т. 1, с. 13]. Такім чынам, яго выкарыстанне ў якасці элемента тэрмінаадзінкі апраўданае і можа спрыяць большай дакладнасці тэрміналагічнай сістэмы (паколькі тэарэтычна можна ўявіць тэрміны *абразія* і *сціранне* з розных галін навукі).

У другім выпадку мы кіраваліся тым, што тэрмін *генатыпаванне* ўжо выкарыстоўваецца ў беларускіх тэкстах. Напрыклад, у навуковым стылі [5, с. 20]. Зафіксаваны ён і ў «Юрыдычным слоўніку» Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь [6]. Тут немалаважна і тое, што на названым рэсурсе пададзены англійскі адпаведнік тэрміна, які супадае з арыгінальным тэрмінам у тэзаўрусе: *genotyping*. Сярод дадатковых фактараў, якія гавораць на карысць гэтага варыянта, можна назваць аднаслоўнасць, а таксама тое, што гэта назоўнік на *-нне*, што дадаткова падкрэслівае працэсуальнае значэнне (пра гэта будзе гаварыцца таксама ніжэй). Дарэчы, у айчынным даведніку рускім адпаведнікам выступае *генотипирование*, а не *генетическая паспортизация*, як у перакладзе тэзаўруса.

У час перакладу сустракаюцца выпадкі, калі розныя тэрміны англійскай мовы перакладаюцца на рускую аднолькава. Напрыклад, у англійскамоўнай частцы ёсць тэрміны *footrot (plants)* і *root rots*. Яны абодва перакладзены на рускую як *гниль корней*. Але наўрад ці можна прызнаць такі пераклад адэкватным, паколькі гэтыя тэрміны абазначаюць блізкія паняцці, што можа прыводзіць да блытаніны.

Каб пазбегнуць такіх праблем, намі гэтыя паняцці разведзены на тэрміналагічным узроўні. У выніку атрымаліся такія радкі адпаведнікаў:

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

footrot (plants) – пнёвая гніль – гниль корней;

root rots – каранёвая гніль – гниль корней.

Важны фактар пры перакладзе тэрмінаў – наяўнасць азначэння арыгінальнай тэрмінаадзінкі. Для перакладчыкаў-практыкаў само сабой зразумелым з'яўляецца тое, што часта скажэнні пры перакладзе ўзнікаюць у выпадках, калі даводзіцца працаваць, не ведаючы, якое значэнне мелі на ўвазе аўтары арыгінальнага тэрміна.

З гэтым фактарам звязаны і адрозненні ў беларускай і рускай частках шматмоўнага тэзаўруса. Як прыклад можна прывесці тэрмін *ratooning*. Арыгінальны тэрмін на англійскай мове мае форму герундыя, які можа перакладацца разнастайнымі адзінкамі беларускай мовы. Гэта могуць быць як дзеепрыметнікі, так і прыметнікі, назоўнікі. У выпадку з *ratooning*, калі зыходзіць з яго дзеепрыметнікавага значэння, можна было б прапанаваць тэрмін *адрастальны*. Калі б гаворка ішла пра від культур, то можна было б запазычыць корань і стварыць прыметнік *ратунны*. Аднак у нашым выпадку было пададзена азначэнне: *Ratooning is the agricultural practice of harvesting a monocot crop by cutting most of the above-ground portion but leaving the roots and the growing shoot apices intact so as to allow the plants to recover and produce a fresh crop in the next season.*

Як відаць з азначэння, гаворка ідзе пра *сельскагаспадарчы метад* збору ўраджаю. Такім чынам, у гэтым выпадку найбольш адэкватным перакладам будзе назоўнік, а менавіта *абрэзванне* або *падрэзванне*.

Гэты прыклад звязаны таксама з тэмай аддзеяслоўных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах, закранутай вышэй. Тут можна прывесці іншыя выпадкі, калі пры перакладзе англійскага герундыя беларускі і рускі варыянты могуць адрознівацца. Возьмем тэрміны *shivering* і *bundling*. Першы перакладзены на рускую мову як *дрожь*, а другі як *связка в пучки*. Калі ў першым выпадку пераклад на беларускую мову ў большай ступені

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

залежыць ад наяўнасці тлумачэння (бо ў адных кантэкстах будзе правільней ужыць *дрыжанне*, а ў іншых *дрыжыкі*), то ў другім выпадку элемент *звязванне* ў складзе тэрмінаадзінкі *звязванне ў пучкі* найлепш перадае значэнне працэсу.

Як асобная праблема-пастка для перакладчыка могуць выступаць выпадкі, у якіх рускі эквівалент звужае значэнне арыгінальнага тэрміна. Напрыклад, разгледзім такі радок адпаведнікаў: *breast height diameter – дыяметр на вышыні грудзей – диаметр на высоте 1,3 м.*

Як бачым, у арыгінальным тэрміне ніякім чынам не пазначана канкрэтная адзінка вымярэння (*м, см*). Тое самае і ў нямецкім (*Brusthöhendurchmesser*) і французскім (*diamètre à hauteur de poitrine*) перакладах. Але ў рускім перакладзе знаходзім 1,3 м. Да таго ж у тэзаўрусе не прыводзіцца дакладнае азначэнне тэрміна. І хоць у гэтым выпадку вялікага скажэння б не адбылося, усе вышэйназваныя фактары, на нашу думку, гавораць за тое, што беларускі варыянт перакладу *дыяметр на вышыні грудзей* – найбольш прымальны.

Безумоўна, падабенства слоў блізкароднасных беларускай і рускай моў можа падштурхоўваць да памылковага перакладу. Гэты вядомы для перакладчыкаў факт можна праілюстраваць некаторымі прыкладамі з шматмоўнага тэзаўруса.

Так, рускамоўны тэрмін *уборка* сам па сабе не можна паспрыяць правільнаму перакладу на беларускую. Паколькі ў беларускай мове рускаму *уборка* адпавядаюць розныя словы. У сельскагаспадарчым значэнні гэта лексема *ўборка* (*убіранне*) або *збор* (*збіранне*). Аднак у іншых выпадках у якасці адэкватнага перакладу могуць выступаць словы *прыманне*; *забіранне*; *здыманне*; *скручванне*; *падыманне*; *прыбіранне, прыборка*; *складанне, складванне*; *хаванне*.

Зыходзячы з гэтага, можна сцвярджаць, што выкарыстанне рускага перакладу для больш хуткага і правільнага разумення тэрмінаў можа нашкодзіць якасці перакладу. Паколькі сёння ўжо

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

існуюць англійска-беларускія слоўнікі, першы варыянт трэба шукаць менавіта ў іх. Так, дзеяслоў *to harvest* (ад якога ўтворана форма герундыя *harvesting*) перакладаецца ў «Англійска-беларускім слоўніку» як *збіра́ць ураджа́й*; *жаць* [2, с. 274]. Таму пры перакладзе непасрэдна з англійскай не павінна ўзнікнуць няправільнага варыянта *прыборка* або падобнага.

Некаторыя рускія тэрміны маюць дадатковыя элементы, паколькі аднаслоўны адпаведнік можа ўспрымацца неадназначна. Напрыклад, у радку *manuals – інструкцыя, даведнік – справочные руководства* слова *справочные* ў рускім перакладзе пададзена толькі таму, што *руководство* можа абазначаць як надрукаваную інструкцыю, так і людзей, якія кіруюць чым-н., або сам працэс кіравання.

У пэўных выпадках у рускай мове ўжо ёсць свая ўстояная сістэма абазначэнняў, якую, аднак, наўрад ці варта пераносіць у беларускую мову. Разгледзім наступны радок: *leaf eating insects – лістаедныя насякомыя – листогрызущие насекомые*. Як бачым, у англійскай мове першыя два тэрмінаэлементы паходзяць ад слоў *leaf* ‘ліст’ і *eat* ‘есці’. Калі звярнуцца да нямецкага перакладу, то там адпаведнікам выступае *blattfressendes Insekt* (першае слова – дзеепрыметнік, утвораны ад *Blatt* ‘ліст’ і *fressen* ‘есці, жэрці’).

Такім чынам, лішнімі ўяўляюцца спробы зрабіць дакладную кальку дзеепрыметніка *листогрызущие* ў беларускай мове, паколькі для зместу паняцця важна тое, што насякомыя *ядуць лісце*, прытым розныя віды могуць есці яго па-рознаму.

Асобныя тэрміны набываюць розны выгляд у беларускай і рускай частках праз тую розніцу, якая існуе паміж лексіка-граматычнымі сістэмамі беларускай і рускай моў. Гэта відаць на прыкладзе перакладу тэрміна *weaners*: у рускай мове яму адпавядае *поросенок-отъемыш*, а ў беларускай – *парася, якое адлучылі ад маткі*.

Падсумоўваючы, адзначым, што руская частка Шматмоўнага тэзаўруса Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Аб’яднаных Нацый AGROVOC у асобных выпадках можа дапамагчы знайсці правільны варыянт перакладу. Аднак вялікая колькасць нюансаў, якія адрозніваюць сістэмы беларускай і рускай моў увогуле і іх тэрміналагічныя падсістэмы ў прыватнасці, не дазваляе карыстацца такім падыходам як асноўным і прымушае арыентавацца ў першую чаргу на англійскамоўны арыгінал.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. AGROVOC Multilingual Thesaurus // Food and Agriculture Organization of the United Nations. – URL: https://agrovoc.fao.org/browse/agrovoc/en/?clang=be (date of access: 23.08.2025).

2. Англійска-беларускі слоўнік = English-Belarusian dictionary : [каля 60 000 слоў і словазлучэнняў] / [Т. М. Суша, А. У. Таболич, А. К. Шчука і інш.] ; пад кіраўн. Т. М. Сушы. – Мн. : Выш. шк., 2013. – 765 с.

3. Древнегреческо-русский словарь : в 2 т. : [ок. 70000 слов] / сост. И. Х. Дворецкий ; под ред. С. И. Соболевского. – М. : ГИС, 1958. – 2 т.

4. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : [каля 25000 слоў і тэрмінаў] : у 2 т. / А. М. Булыка. – Мн. : Бел. Энцыкл., 1999. – 2 т.

5. Сосинович, С. В. Молекулярно-генетическая характеристика рекомбинантных форм вируса иммунодефицита человека 1 типа, выявленных на территории Республики Беларусь : автореф. дис. … канд. биол. наук : 03.02.02 / Сосинович Святослав Викторович ; Респ. науч.-практ. центр эпидемиологии и микробиологии. – Мн., 2016. – 22 с.

6. Генатыпаванне // Юрыдычны слоўнік. – URL: https://multilang.pravo.by/be/term/index/27082?langname=be&page=1&type=3&etalon=0 (дата звароту: 25.08.2025).

References:

1. AGROVOC Multilingual Thesaurus. *Food and Agriculture Organization of the United Nations*. Available at: https://agrovoc.fao.org/browse/agrovoc/en/ (accessed 23.08.2025).

2. Susha T. M. (ed.). *English-Belarusian dictionary*. Minsk, Vysheishaya shkola Publ., 2013. 765 p. (in Belarusian).

3. Dvoretskii I. Kh. (comp.). *Ancient Greek-Russian dictionary: in 2 volumes*. Moscow, GIS Publ., 1958. 2 vol. (in Russian).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

4. Bulyka A. M. *Dictionary of Foreign Words: in 2 volumes*. Minsk, Belaruskaya Entsyklapedyya Publ., 1999. 2 vol. (in Belarusian).

5. Sosinovich S. V. *Molecular genetic characteristics of recombinant forms of human immunodeficiency virus type 1, identified in the territory of the Republic of Belarus*. Abstract of Ph. D. diss. Minsk, 2016. 22 p. (in Russian).

6. Genotyping. *Legal dictionary*. Available at: https://multilang.pravo.by/en/term/index/27082?size=25&type=3&langname=en (accessed 25.08.2025).

Дата паступлення артыкула 22.10.2025
Received 22.10.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 81’373.46
https://doi.org/10.5281/zenodo.17598095

А. М. Лапцёнак

Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

БЕЛАРУСКАМОЎНАЯ ВЕРСІЯ ТЭЗАЎРУСА AGROVOC: ПАДЫХОДЫ ДА АДБОРУ ЛЕКСІЧНЫХ АДЗІНАК

Анатацыя. У артыкуле разгледжаны асаблівасці падрыхтоўкі беларускамоўнай версіі тэзаўруса AGROVOC. Апісаны падыходы, выкарыстаныя пры адборы адпаведнікаў для корпуса тэрмінаў, адзначана спецыфіка прадстаўлення інтэрнацыянальных і нацыянальных па форме тэрміналагічных адзінак, закрануты пытанні аманіміі тэрмінаў.

Ключавыя словы: AGROVOC, тэзаўрус, тэрмін, тэрміналагічная сістэма, крытэрыі адбору.

Для цытавання. Лапцёнак, А. М. Беларускамоўная версія тэзаўруса AGROVOC: падыходы да адбору лексічных адзінак / А. М. Лапцёнак // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 147–157.

Е. Н. Лаптёнок

Институт языкознания имени Якуба Коласа Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси, Минск, Беларусь

БЕЛОРУССКОЯЗЫЧНАЯ ВЕРСИЯ ТЕЗАУРУСА АГРОВОК: ПОДХОДЫ К ОТБОРУ ЛЕКСИЧЕСКИХ ЕДИНИЦ

Аннотация. В статье рассмотрены особенности подготовки белорусскоязычной версии тезауруса AGROVOC. Описаны подходы, использованные при подборе соответствий для корпуса терминов, отмечена специфика представления интернациональных и национальных по форме терминологических единиц, затронуты вопросы омонимии терминов.

Ключевые слова: AGROVOC, тезаурус, термин, терминолоическая система, критерии отбора.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Alena M. Laptsionak

Yakub Kolas Institute of Linguistics of the Centre for Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

BELARUSIAN VERSION OF THE AGROVOC THESAURUS: APPROACHES TO SELECTION OF LEXICAL UNITS

Abstract. The article discusses the features of the preparation of the Belarusian-language version of the AGROVOC thesaurus. The approaches used in the selection of correspondences for the corpus of terms are described, the specifics of the presentation of international and national terminological units are noted, and issues of homonymy of terms are touched upon.

Keywords: AGROVOC, thesaurus, term, terminological system, selection criteria.

For citation. Laptsionak A. M. Belarusian version of the AGROVOC thesaurus: approaches to selection of lexical units. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 147–157 (in Belarusian).

Гісторыя праекта AGROVOC пачынаецца з 1980-х гг., калі была распрацавана тэрміналагічная база па сельскай гаспадарцы, першапачаткова апублікаваная ў выглядзе друкаваных каталогаў [1]. Сёння гэты шматмоўны корпус тэрміналагічных адзінак размешчаны ў свабодным доступе ў інтэрнэце і змяшчае больш за 41 тысячу базавых тэрмінаў, а агульны аб’ём з улікам сінанімii складае 1 219 000 адзінак на 42 мовах [2]. Прадстаўлена там і беларуская мова. Зыходным пунктам падрыхтоўкі беларускамоўнай версіі можна лічыць 2020 г., калі да праекта далучылася Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча ў якасці каардынатара, а ў 2022 г. да падрыхтоўкі корпуса прыступілі айчынныя філолагі, якія займаліся падборам беларускамоўных эквівалентных тэрміналагічных адзінак. Сёння на сайце FAO размешчана каля 20 тысяч беларускамоўных адпаведнікаў тэрмінаў.

Паспяховая распрацоўка нацыянальнай версіі тэзаўруса, акрамя лінгвістычнай дасведчанасці, патрабуе ведання

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

структуры і прынцыпаў арганізацыі корпуса тэрмінаў. Асноўным элементам гэтай базы звестак з'яўляюцца пераважныя, базавыя тэрміны, або канцэпты, дэскрыптары, паміж якімі ўстаноўлены розныя лагічныя сувязі. Пры дэскрыптарах фіксуюцца альтэрнатыўныя тэрміны (аскрыптары, сінонімы канцэптаў). Падбор беларускіх тэрміналагічных адзінак праводзіўся ў адпаведнасці з крытэрыямі нарматыўнасці, сінхроннасці, ужывальнасці (частотнасці), уліку спалучальнасці і тэрмінаўтваральнай здольнасці. На аснове праведзенага аналізу выбраных беларускіх тэрмінаў-адпаведнікаў для корпуса AGROVOC стала магчымым вызначыць некаторыя дадатковыя падыходы да адбору адзінак на лексіка-семантычным узроўні.

Натуральна, што пры выбары тэрміналагічнай адзінкі неабходна звяртацца да сучасных спецыяльных галіновых слоўнікаў і энцыклапедычных выданняў, у якіх змешчаны адзінкі, што адлюстроўваюць традыцыю ўжывання тэрміна і адпавядаюць моўным нормам. У якасці крыніц тэрмінаў могуць прымяняцца і нетэрміналагічныя выданні – падручнікі і дапаможнікі вышэйшай школы, навуковыя артыкулы. У тэзаўрусе базавай з'яўляецца сельскагаспадарчая тэрміналогія, але прадстаўлены таксама тэрміны іншых навук – фізікі, хіміі, эканомікі, правазнаўства, сацыялогіі і інш. Сёння тэрмінасістэмы гэтых галін ведаў дастаткова добра ўпарадкаваны, тэрмінаадзінкі прадстаўлены ў разнастайных слоўніках, даведніках і энцыклапедыях, якія і выкарыстоўваліся пры падборы эквівалентаў: *bunding – абвалаванне, berry crops – ягадныя культуры, floriculture – кветкаводства, rooting – укараненне, plant structure – будова расліны, acquired immunity – набыты імунітэт, skull – чэрап, wind resistance – ветраўстойлівасць, consistency – кансістэнцыя, radio waves – радыёхвалі, property – маёмасць, debt – доўг* і г.д. Больш складана падабраць адпаведнікі для тэрмінаў, што абазначаюць рэаліі, не характэрныя для Беларусі, або новых тэрміналагічных паняццяў. Адзінкі, што

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

абазначаюць такія паняцці, могуць функцыянаваць у беларускамоўным дыскурсе ў розных фанетыка-арфаграфічных варыянтах, мець значную колькасць сінонімаў або наогул не мець эквівалентных адпаведнікаў на сучасным этапе. У такіх выпадках неабходна падабраць семантычна тоесны арыгінальнаму паняццю адпаведнік з улікам базавых патрабаванняў да тэрміналагічных адзінак. Так, для англ. *fish poisoning* быў выбраны эквівалент *лоўля з прымяненнем атрутных рэчываў,* а для *pump fishing – лоўля рыбы помпай.* Параўн. таксама: *echinoderm culture – культываванне ігласкурых, развядзенне ігласкурых, companion planting – спадарожная пасадка; sablefish – вугальная рыба; spray drift – знос пры апырскванні* і інш.

У складзе некаторых арыгінальных тэрміналагічных адзінак ужываюцца тоесныя кампаненты, падаецца мэтазгодным у працэсе падбору эквівалентных тэрмінаадзінак адзін і той жа кампанент у складзе розных спалучэнняў перадаваць аднастайна. Так, назоўнік *tolerance* ў межах розных тэрмінаў быў перакладзены як *устойлівасць*: *drought tolerance – засухаўстойлівасць, cold tolerance – холадаўстойлівасць, drug tolerance – устойлівасць да лекаў, disease tolerance – устойлівасць да захворванняў*. Аднак гэты падыход нельга назваць абсалютным, у складзе асобных тэрмінаў такія кампаненты могуць перадавацца іншымі лексічнымі адзінкамі. Напрыклад, субстантыў *culture* ў складзе розных спалучэнняў перадаецца аддзеяслоўным назоўнікам *культываванне*: *культываванне амараў, культываванне крабаў, культываванне крэветак, кантэйнеры для культывавання* і інш. Але побач з імі прадстаўлены адрозны па форме традыцыйны адпаведнік: *pearl culture – вырошчванне жэмчугу*.

Пры выбары эквівалентаў з тэрміналагічных адзінак, якія ў нацыянальнай мове здаўна маюць некалькі сінонімаў, перавага павінна аддавацца больш пашыранай адзінцы. Паводле даных нацыянальнага корпуса беларускай мовы, тэрмін *Bordeaux*

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

mixture прадстаўлены ў беларускамоўным дыскурсе спалучэннямі прыметніка *бардоскі* з граматычна галоўнымі субстантывамі *вадкасць, сумесь, жыжка і цеча* [3]. Калі спалучэнні *бардоская жыжка* і *бардоская цеча* можна лічыць устарэлымі (яны адзначаюцца выключна ў перыёдыцы 20–30 гг. XX ст.), то выразы *бардоская вадкасць* і *бардоская сумесь* шырока ўжываюцца ў сучасных выданнях, у тым ліку энцыклапедычных даведніках, школьных падручніках, на старонках СМІ. Колькасная перавага спалучэння *бардоская вадкасць* дала падставы выбраць яго ў якасці эквівалентнай адзінкі да англійскага тэрміна.

Крытэрыем выбару тэрмінаадзінкі з'яўляецца таксама яе фіксацыя ў больш аўтарытэтных крыніцах (напрыклад, энцыклапедыі або галіновым слоўніку ў параўнанні з агульнамоўным слоўнікам ці падручнікам). Да прыкладу, канцэпт *chervil* атрымаў адпаведнікі *маркоўнік* і ў якасці сіноніма – *кервель* згодна з матэрыяламі спецыялізаваных даведнікаў. Для назвы *tarragon* дэскрыптарам быў абраны тэрмін *эстрагон,* а *тархун* пазначаны як альтэрнатыўны. Менавіта такі падыход адзначаецца ў «Беларускай энцыклапедыі» [4, т. 18, кн. 1 с. 171]. У шматтомным даведніку «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» *эстрагон* таксама вынесены ў рэестр [5, с. 439]. Для лацінскага наймення *Morus* былі прапанаваны як аскрыптары нацыянальныя па форме адпаведнікі *тут, морва*, зафіксаваныя ў «Лаціна-руска-беларускім батанічным слоўніку» А.І. Кісялеўскага, які хоць і быў выдадзены ў 1967 г, да гэтага часу не губляе актуальнасці. Параўн. таксама*: cinnamon – карыца, цынамон, garden biennials – садовыя двухгадовыя расліны, садовыя двухлетнікі, bee plants – меданосныя расліны, меданосы* і інш.

У той жа час аналіз значнай колькасці адпаведнікаў да адзінак арыгінала ў тэзаўрусе дазваляе сцвярджаць, што адбор тэрмінаў праводзіўся з улікам прынцыпу інтэрнацыяналізацыі, які К. П. Любецкая тлумачыць як суаднесенасць беларускіх тэрмінаў

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

з блізкімі па форме іншамоўнымі адзінкамі з вызначэннем паміж імі дакладных адпаведнасцей і выбару з ліку сінонімаў інтэрнацыянальных формаў у якасці адпаведніка [6, с. 22].

Даследчыкі айчыннай тэрміналогіі адзначалі, што ў розныя перыяды яе функцыянавання перавага аддавалася тым ці іншым спосабам упарадкавання тэрмінаў, абумоўленым асаблівасцямі сацыякультурнай і моўнай арыентацыі грамадства [6, с. 18]. У агульным іх можна звесці да дзвюх супрацьлеглых тэндэнцый – інтэрнацыяналізацыі і арыентацыі на нацыянальныя моўныя сродкі, а перыяду канца XX ст. уласціва іх пэўнае спалучэнне, суіснаванне. Падобнае адзінства дзвюх тэндэнцый у тэрміналогіі Д. В. Дзятко лічыць найбольш канструктыўным, паколькі «арыентацыя на нацыянальныя моўныя рэсурсы дазваляе тэрмінасістэме гарманічна ўваходзіць у сістэму нацыянальнай мовы, а выкарыстанне інтэрлексаў дазваляе максімальна ўніфікаваць міжнародную тэрміналогію» [7, с. 116].

Працэс інтэрнацыяналізацыі тэрміналогіі канца XX ст. быў выкліканы ўзмацненнем ролі англійскай мовы ў міжнароднай камунікацыі, гэта тэндэнцыя захоўваецца і сёння, яна абумоўлена спробамі гарманізацыі тэрміналогіі. Шматмоўныя банкі даных, да якіх адносіцца і AGROVOC, дазваляюць сабраць і захаваць інфармацыю «аб асаблівасцях тэрмінаў, іх ужыванні, эквівалентах і ступені ўпарадкаванасці», і ў той жа час з'яўляюцца «сродкам фіксацыі міжнародных рашэнняў па ўпарадкаванні семантыкі тэрмінаў» [6, с. 22]. Актыўнае развіццё навукі і тэхнікі прыводзіць да з'яўлення іншамоўных запазычанняў. Такія тэрміны шырока адзначаюцца ў беларускамоўнай версіі тэзаўруса: *biotransformation of xenobiotics – біятрансфармацыя ксенабіётыкаў, crossing over – красінговер, replication – рэплікацыя, Ectomycorrhizae – эктамікрыза, merchandising – мерчандайзінг, dumping – дэмпінг, cartels – картэль, tangelos – танжэла, jack fruit – джэкфрут, mitosis – мітоз, biotin – біяцін, вітамін H, adaptability – адаптыўнасць* і г.д.).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У той жа час прынцыпы пабудовы тэзаўруса дазваляюць актыўна выкарыстоўваць і нацыянальныя моўныя сродкі. Як справядліва адзначаў В. П. Красней, «без арыентацыі на спрадвечныя моўныя рэсурсы нельга сфарміраваць нацыянальную па форме тэрміналогію» [8, с. 186]. Пры сінаніміі тэрміналагічныя адзінкі з нацыянальнай формай падаваліся ў тэзаўрусе ў якасці альтэрнатыўных тэрмінаў: *Aujeszky's disease – хвароба Аўескі, несапраўднае шаленства; gurnards – трыгла, марскі певень; tycoprotein – мікапратэін, бялок грыбоў; transmissions – трансмісія, каробка перадач; latex – латэкс, млечны сок; stecklings – штэклінг, насеннік; acupuncture – акупунктура, іголкалячэнне* і інш. Такі падыход дазваляе ў тым ліку ажыццяўляць працу з тэзаўрусам больш эфектыўна, бо сінанімія не становіцца перашкодай пры пошуку суадносных тэрмінаў – ён можа ажыццяўляцца як па канцэптах, так і па альтэрнатыўных адзінках. Варта адзначыць, што ў лінгвістыцы да гэтага часу няма адзінага разумення паняццяў варыянтнасць, сінанімія і дублетнасць, навукоўцы прапануюць розныя погляды на гэтыя з'явы, гл., напрыклад у [9]. Такая разнастайнасць тлумачыцца адсутнасцю на сучасным этапе агульнага несупярэчлівага падыходу да пытання суаднесенасці формы і зместу слова ў лексікалогіі, якое ў тэрміналогіі ўскладняецца састаўной формай намінатыўнай адзінкі. У тэрміналогіі таксама пашырана думка, згодна з якой сінанімія тэрміналагічных адзінак з'яўляецца недахопам тэрміналагічнай сістэмы, яна часцей адзначаецца на пачатковым этапе ўзнікнення тэрмінаў [10, с. 14], што сведчыць аб яе нераспрацаванасці. У ідэале для тэрмінасістэмы «характэрна ўзаемаадназначная адпаведнасць паміж тэрмінам і паняццем (адзін тэрмін ↔ адно паняцце)» [8, с. 118]. Але мы падтрымліваем думку, выказаную некаторымі лінгвістамі (напрыклад, В. П. Даніленка), што сінанімія ў тэрміналогіі з'яўляецца вынікам натуральнага праяўлення законаў развіцця лексікі літаратурнай мовы, а ў межах артыкула

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

да падобных адзінак ужываем тэрмін сінонім, не паглыбляючыся ў праблему суаднесенасці паняццяў сінонім, дублет, варыянт.

З практычнага пункту погляду пэўныя праблемы пры падборы эквівалентаў складае наяўнасць міжнавуковых амонімаў у тэзаўрусе. Аманімія можа закранаць англамоўныя адзінкі, так, у корпусе прадстаўлены два тэрміны *dredging,* якія адносяцца да розных галін ведаў. Для размежавання пры адным з іх выкарыстоўваецца семантычнае ўдакладненне, што абазначае больш шырокае відавое паняцце: *dredging (catching methods).* Падобнае семантычнае ўдакладненне было прыменена і ў беларускамоўным адпаведніку: *драгіраванне (спосаб лоўлі).* Другі тэрмін *dredging* не быў уключаны ў склад адзінак, для якіх падбіраліся адпаведнікі, але пры яго перакладзе найлепшым спосабам перадачы, на наш погляд, будзе фіксацыя сінанімічнага тэрміна: *dredging – драгіраванне, днопаглыбленне.* Такія відавыя ўдакладненні выкарыстоўваюцца і пры фіксацыі аманімічных наменклатурных найменняў, якія ў тэзаўрусе звычайна не перакладаюцца на іншыя мовы, а даюцца ў лацінамоўным напісанні. Так, *Calamus (fish)* у беларускай версіі фіксуецца як *Calamus (рыба)*, паколькі ў AGROVOC прадстаўлена адзінка *Calamus (Palmae)*.

Розныя спосабы забеспячэння эквівалентнасці тэрмінаў выкарыстоўваюцца, калі аманімія ўласціва беларускім тэрмінаадзінкам пры фармальным адрозненні арыгінальных тэрмінаў. Англійскія лексемы *farrier* і *blacksmith* маюць адзіны нарматыўны перакладны адпаведнік *каваль* у беларускай мове. Каб пазбегнуць аманіміі і развесці паняцці, быў выкарыстаны прыём семантычнага ўдакладнення: *каваль і каваль (майстар).* Таксама адзін перакладны адпаведнік *рыбін клей* маюць англійскія тэрміны *fish glue* і *isinglass*. Для першай адзінкі быў выбраны эквівалент *рыбін клей*, а для другой прапанаваны шматкампанентны тэрмін *рыбін клей харчовы* з альтэрнатыўным тэрмінам-англіцызмам *ізінглас*.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Работа над беларускамоўнай версіяй тэзаўруса таксама выразна паказала, што неабходна ўлічваць месца тэрміна ў іерархічнай структуры базы AGROVOC і сувязь з іншымі адзінкамі пры падборы эквівалентаў. Пры наяўнасці некалькіх перакладных адпаведнікаў лексемы *marasmus – маразм, агульнае знясіленне, агульная атрафія* і інш. у якасці канцэпту быў выбраны выраз *аліментарная дыстрафія*, паколькі тэрмін уключаецца ў больш шырокія паняцці *malnutrition – недастатковае харчаванне і protein deficiencies – дэфіцыт бялку*. Параўн. у «Беларускай энцыклапедыі»: **ДЫСТРАФІЯ АЛІМЕНТАРНАЯ**, … хвароба, што развіваецца пры адсутнасці ці недастатковым паступленні харчовых рэчываў у арганізм [4, т. 6, с. 297]; **МАРАЗМ**, … паступовае згасанне псіхічнай дзейнасці чалавека з агульным знясіленнем і атрафіяй органаў і тканак [4, т. 10, с. 102]. У значнай ступені выбару дакладнага адпаведніка садзейнічае азначэнне, размешчанае ў тэзаўрусе, якое дазваляе размежаваць блізкія паняцці.

Такім чынам, падрыхтоўка беларускамоўнага корпуса тэзаўруса AGROVOC засведчыла шырокія магчымасці беларускай мовы ў стварэнні эквівалентнай базы тэрмінаў сельскай гаспадаркі і сумежных навук. Пры адборы тэрміналагічных лексічных адзінак для корпуса тэрмінаў былі прыменены такія падыходы, як выкарыстанне пастаянных міжмоўных тэрміналагічных адпаведнікаў, зафіксаваных у нарматыўных даведніках; па магчымасці аднастайная перадача тоесных лексічных адзінак у складзе тэрмінаў; выкарыстанне найбольш пашыраных тэрмінаў пры іх сінанімії; прымяненне прынцыпу інтэрнацыяналізацыі адначасова з фіксацыяй нацыянальных па форме тэрмінаадзінак; ужыванне дадатковых прыёмаў для забеспячэння эквівалентнасці тэрмінаў, а таксама ўлік месца тэрміна ў іерархічнай структуры тэзаўруса.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Об АГРОВОК // Продовольственная и сельскохозяйственная организация Объединенных Наций. – URL: https://www.fao.org/agrovoc/ru/об-агровок (дата обращения: 10.10.2025).

2. AGROVOC Multilingual Thesaurus // Food and Agriculture Organization of the United Nations. – URL: https://agrovoc.fao.org/browse/agrovoc/ru/?clang=en (date of access: 10.10.2025).

3. Нацыянальны корпус беларускай мовы (беларускі N-корпус). – URL: https://bnkorpus.info/ (дата звароту: 10.10.2025).

4. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 1996–2004. – 18 т.

5. Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ, 1983–1986. – Т. 5 : Стаўраструм – Яшчур. – 1986. – 583 с.

6. Любецкая, Е. П. Белорусская национальная терминология: тенденции формирования в XX–XXI вв. / Е. П. Любецкая // Термінологічний вісник. – 2015. – Вип. 3 (1). – С. 17–24.

7. Дятко, Д. В. Об основных тенденциях в развитии белорусской и украинской математической терминологии и терминографии / Д. В. Дятко // Актуальные вопросы современной филологии: теоретические проблемы и прикладные аспекты : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 80-летию акад. М. М. Багизбаевой (Четвертые Багизбаевские чтения) / Каз. нац. ун-т ; редкол.: К. Абдезулы [и др.]. − Алматы, 2012. – С. 114–117.

8. Красней, В. П. Беларуская тэрміналогія : зб. арт. / В. П. Красней ; рэдкал.: Э. А. Ялоўская (адк. рэд.) [і інш.] ; навук. рэд. М. Р. Прыгодзіч. – Мн. : БДУ, 2011. – 216 с.

9. Палуян, А. М. Сінанімія і дублетнасць тэрмінаў фізічнай геаграфіі / А. М. Палуян // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – 2014. – № 1 (82). – С. 119–122.

10. Буракова, М. У. Беларуская мова. Тэхнічная тэрміналогія : вучэб. дапам. / М. У. Буракова. – Мн. : РІВШ, 2016. – 262 с.

References:

1. About AGROVOC. *Food and Agricultural Organization of the United Nations*. Available at: https://www.fao.org/agrovoc/about (accessed 10.10.2025).

2. *AGROVOC Multilingual Thesaurus*. Available at: https://agrovoc.fao.org/browse/agrovoc/ru/?clang=en (accessed 10.10.2025).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

3. *National Corpus of the Belarusian language*. Available at: https://bnkorpus.info/index.en.html (accessed 10.10.2025).

4. Pashkou G. P. (ed.). *Belarusian encyclopedia: in 18 volumes*. Minsk, Belaruskaya Entsyklapedyya Publ., 1996–2004. 18 vol. (in Belarusian).

5. Shamyakin I. P. (ed.). *Encyclopedia of the Nature of Belarus: in 5 volumes. Vol. 5*. Minsk, Belaruskaya Savetskaya Entsyklapedyya Publ., 1986. 583 p. (in Belarusian).

6. Liubetskaya E. P. "Belarusian national terminology: trends of formation in the 20th–21st centuries. *Terminologichnii visnik* [Terminological Bulletin], 2015, iss. 3 (1), pp. 17–24 (in Russian).

7. Dyatko D. V. On the main trends in the development of Belarusian and Ukrainian mathematical terminology and terminography. *Aktual'nye voprosy sovremennoi filologii: teoreticheskie problemy i prikladnye aspekty: materialy Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii, posvyashchennoi 80-letiyu akademika M. M. Bagizbaevoi (Chetvertye Bagizbaevskie chteniya)* [Topical issues of modern philology: theoretical problems and applied aspects: proceedings of the International scientific and practical conference dedicated to the 80th anniversary of academician M. M. Bagizbaeva (Fourth Bagizbaeva Readings)]. Almaty, 2012, pp. 114–117 (in Russian).

8. Krasnei V. P. *Belarusian terminology: collection of articles*. Minsk, Belarusian State University, 2011. 216 p. (in Belarusian).

9. Poluyan E. N. Synonymy and doublet terms of physical geography. *Izvestiya Gomel'skogo gosuidarstvennogo universiteta im. F. Skoriny = Proceedings of Francisk Scorina Gomel State University*, 2014, no. 1 (82), pp. 119–122 (in Belarusian).

10. Burakova M. V. *Belarusian language. Technical terminology*. Minsk, Republican Institute of Higher Education, 2016. 262 p. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 05.11.2025
Received 05.11.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 811.161.3’373.421
https://doi.org/10.5281/zenodo.17598114

О. А. Морозова

Белорусская сельскохозяйственная библиотека имени И. С. Лупиновича Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

ОБ ОСОБЕННОСТЯХ ИНТЕРПРЕТАЦИИ СИНОНИМИЧНЫХ ПОНЯТИЙ ТЕЗАУРУСА AGROVOC ПРИ ПОДБОРЕ БЕЛОРУССКИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ ИНОЯЗЫЧНЫХ ТЕРМИНОВ

Аннотация. В статье рассматриваются проблемы перевода и унификации аграрной терминологии на примере терминов в области животноводства, птицеводства и ветеринарии. На основе анализа тезаурусов и специализированных словарей выявлены расхождения в интерпретации таких понятий, как aviculture, disease management, livestock production, animal husbandry, animal breeding и livestock raising. Показано, что в национальной практике наблюдается тенденция к унификации различных англоязычных терминов под общим словом «животноводство», что приводит к потере смысловых различий и затрудняет научную коммуникацию. Особое внимание уделено проблемам многоэквивалентности и безэквивалентной лексики, а также необходимости привлечения отраслевых специалистов для уточнения дефиниций. В результате предложены разграниченные белорусскоязычные эквиваленты ключевых терминов, что позволит обеспечить точность, согласованность и сопоставимость терминологии в национальной и международной научной среде.

Ключевые слова: аграрная терминология, животноводство, птицеводство, ветеринария, перевод, унификация, AGROVOC, глоссарий, многоэквивалентность, безэквивалентная лексика.

Для цитирования. Морозова, О. А. Об особенностях интерпретации синонимичных понятий тезауруса AGROVOC при подборе белорусских эквивалентов иноязычных терминов / О. А. Морозова // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 158–169.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

А. А. Марозава

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І. С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ПРА АСАБЛІВАСЦІ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ СІНАНІМІЧНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ ТЭЗАЎРУСА AGROVOC ПРЫ ПАДБОРУ БЕЛАРУСКІХ ЭКВІВАЛЕНТАЎ ІНАЗАМОВЫХ ТЭРМІНАЎ

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца праблемы пераводу і уніфікацыі аграрнай тэрміналогіі на прыкладзе тэрмінаў у галіне жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі і ветэрынарыі. На аснове аналізу тэзаўрусаў і спецыялізаваных слоўнікаў выяўлены разыходжанні ў інтэрпрэтацыі такіх паняццяў, як aviculture, disease management, livestock production, animal husbandry, animal breeding і livestock raising. Паказана, што ў нацыянальнай практыцы назіраецца тэндэнцыя да уніфікацыі розных англамоўных тэрмінаў пад агульным словам "жывёлагадоўля", што прыводзіць да страты сэнсавых адрозненняў і абцяжарвае навуковую камунікацыю. Адмысловая ўвага нададзена праблемам шматэквівалентнасці і безэквівалентнай лексікі, а таксама неабходнасці прыцягнення галіновых адмыслоўцаў для ўдакладнення дэфініцый. У выніку прапанаваны размежаваныя беларускамоўныя эквіваленты ключавых тэрмінаў, што дазволіць забяспечыць дакладнасць, узгодненасць і супастаўнасць тэрміналогіі ў нацыянальным і міжнародным навуковым асяроддзі.

Ключавыя словы: аграрная тэрміналогія, жывёлагадоўля, птушкагадоўля, ветэрынарыя, пераклад, уніфікацыя, AGROVOC, гласарый, шматэквівалентнасць, безэквівалентная лексіка.

Oksana A. Morozova

I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

ON THE SPECIFICS OF INTERPRETING SYNONYMOUS CONCEPTS OF THE AGROVOC THESAURUS WHEN SELECTING BELARUSIAN EQUIVALENTS FOR FOREIGN-LANGUAGE TERMS

Abstract. The article explores the challenges of translating and standardizing agricultural terminology, using examples from livestock farming, poultry breeding, and veterinary science. Through an analysis of thesauri and specialized dictionaries,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

discrepancies were identified in the interpretation of terms such as aviculture, disease management, livestock production, animal husbandry, animal breeding, and livestock raising. The study reveals a national tendency to unify various English-language terms under the umbrella of "livestock farming," which leads to the loss of semantic distinctions and hinders scientific communication. Special attention is given to issues of multi-equivalence and non-equivalent vocabulary, as well as the need to involve industry experts in refining definitions. As a result, differentiated Belarusian-language equivalents for key terms are proposed, aiming to ensure accuracy, consistency, and comparability of terminology in both national and international scientific contexts.

Keywords: agricultural terminology, animal husbandry, poultry farming, veterinary science, translation, standardization, AGROVOC, glossary, multi-equivalence, non-equivalent vocabulary.

For citation. Morozova O. A. On the specifics of interpreting synonymous concepts of the AGROVOC thesaurus when selecting Belarusian equivalents for foreign-language terms. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 158–169 (in Russian).

С 2025 года в Белорусской сельскохозяйственной библиотеке (БелСХБ) реализуется проект по созданию белорусскоязычного терминологического глоссария на основе международного тезауруса AGROVOC[1], который будет функционировать как открытая поисковая система. Данный ресурс ориентирован на использование наиболее употребительных словоформ, зафиксированных в международной практике, и предполагает современный формат представления информации: каждая словарная статья будет включать нормативное определение, ссылку на соответствующий термин в AGROVOC, пример употребления в контексте, а также отсылку к электронному каталогу БелСХБ. Особое значение придаётся белорусскому языку как стратегическому инструменту развития национальной научной и информационной инфраструктуры. Кроме того, каждая статья будет содержать связи с белорусскоязычными научно-отраслевыми изданиями, что обеспечит интеграцию

[1]Информация о словаре // AGROVOC Multilingual Thesaurus / FAO. URL: https://agrovoc.fao.org/browse/agrovoc/ru/ (дата обращения: 02.10.2025).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

словаря в единую систему научной коммуникации и позволит пользователям переходить от термина к конкретным публикациям.

Важной предпосылкой для реализации данного проекта стал лексикографический анализ, проведённый в БелСХБ. В ходе исследования была осуществлена систематизация словоформ, применяемых при индексации белорусскоязычных сельскохозяйственных изданий. В результате были выявлены наиболее частотные общенаучные и отраслевые термины, отражающие ключевые понятия и процессы аграрной сферы. Эти данные послужили основой для формирования специализированного терминологического глоссария, призванного обеспечить единообразие и точность при переводе и интерпретации профессиональной лексики.

Вместе с тем в ходе анализа англоязычных, русскоязычных и белорусскоязычных терминов по сельскому хозяйству специалисты столкнулись с проблемами их интерпретации: одни и те же англоязычные термины в разных словарях трактуются по-разному, что затрудняет выработку точного и универсального толкования. Особенно ярко эта проблема проявилась при работе с терминологией в области животноводства, где различия в дефинициях могут существенно влиять на понимание содержания научных публикаций и практических рекомендаций. Проведённый анализ показал необходимость унификации и согласования терминов, что ещё раз подтверждает значимость создаваемого глоссария как инструмента обеспечения точности и сопоставимости аграрной информации.

В ходе работы над глоссарием выявились такие трудности, как многоэквивалентность (наличие нескольких возможных переводов одного и того же термина в зависимости от контекста) и безэквивалентная лексика (отсутствие точного соответствия термину в другом языке). Эти явления существенно осложняют процесс перевода и требуют не только лексикографического

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

анализа, но и привлечения отраслевых специалистов для уточнения семантики.

В связи с этим одной из ключевых задач исследования стал анализ интерпретации некоторых терминов на английском, русском и белорусском языках на примере тематики «Сельскохозяйственные животные и животноводство. Ветеринарная медицина», вызвавших затруднения в их толковании, а также сопоставление того, как различные ресурсы – международные тезаурусы и специализированные словари – интерпретируют одни и те же понятия. Проблема неоднозначности особенно ярко проявляется при анализе отдельных терминов.

Так, рассмотрение понятия **aviculture** позволяет наглядно показать, как различия в дефинициях влияют на точность научной коммуникации. Анализ данного термина выявил значительные расхождения в его интерпретации различными лексикографическими и нормативными источниками, что подтверждает актуальность проблемы многоэквивалентности и безэквивалентной лексики в аграрной терминологии.

В международном тезаурусе **AGROVOC** данный термин закреплён как концепт и в русскоязычной версии представлен как *авикультура*, тогда как в белорусскоязычной версии он переводится как *птушкагадоўля*. Такая вариативность указывает на отсутствие единого подхода к его закреплению в национальных языках.

Сопоставление с другими источниками демонстрирует ещё более широкий спектр трактовок. Так, в *Современном англо-русском словаре по животноводству* (2012 г.) термин *aviculture* переводится как *птицеводство* [1, с. 26], при этом для термина *poultry farming* также приводится эквивалент *птицеводство* [1, с. 120]. Это свидетельствует о наложении значений и отсутствии чёткой дифференциации между терминами.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

В *Comprehensive Veterinary Dictionary* (2021) термин *aviculture* определяется как «the rearing and breeding of birds, usually caged» [2, с. 104], что указывает на более узкое понимание – разведение преимущественно декоративных или клеточных птиц. В то же время в том же словаре термин *poultry* трактуется как «farmed, domestic birds including fowls, turkeys, ducks, geese» [2, с. 886], то есть охватывает исключительно сельскохозяйственные виды.

В нормативных документах также фиксируются различия. Согласно ГОСТу «Птицеводство» [3, с. 1], данный термин определяется как «отрасль животноводства, занимающаяся разведением и использованием разных видов сельскохозяйственной птицы для производства и переработки яиц, мяса, пера, пуха». Таким образом, в отечественной нормативной традиции *птицеводство* имеет строгое отраслевое значение, связанное с сельскохозяйственным производством.

Особый интерес представляет *Информационно-поисковый тезаурус по сельскому хозяйству и продовольствию*[1] Федерального государственного бюджетного научного учреждения «Центральная научная сельскохозяйственная библиотека» (ФГБНУ ЦНСХБ), где термин *aviculture / авикультура* отсутствует, а для термина *птицеводство* приводятся два иноязычных эквивалента: *poultry breeding* и *poultry production*, с отсылкой к эквивалентному термину в другом тезаурусе – *poultry farming*. Это ещё раз подтверждает, что в национальной практике закреплён именно термин *птицеводство*, тогда как *aviculture* остаётся периферийным и неустоявшимся.

[1]Информационно-поисковый тезаурус по сельскому хозяйству и продовольствию // Центральная научная сельскохозяйственная библиотека. URL: https://www.cnshb.ru/jour/th_home.asp?sinp=qthes (дата обращения: 15.10.2025).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Дополнительно установлено, что ряд исследователей использует термин *aviculture* при переводе заглавий и ключевых слов научных статей для обозначения понятия *птицеводство*. Такой подход нельзя признать корректным, поскольку он не учитывает различия в объёме понятий: *aviculture* в международной практике охватывает не только сельскохозяйственное птицеводство, но и разведение декоративных и диких видов птиц. Это приводит к искажению смысла и затрудняет поиск релевантной информации в международных базах данных.

Таким образом, проведённый анализ показал, что термин *aviculture* является примером проблемной единицы и его использование требует строгой контекстуализации и унификации, что должно найти отражение в создаваемом белорусскоязычном терминологическом глоссарии.

В результате проведенного анализа рекомендуется закрепить в белорусскоязычном глоссарии основной эквивалент *птушкагадоўля* для сельскохозяйственного контекста; *авікультура* – как дополнительный международный термин с пояснением. Разграничить употребление терминов: в аграрных публикациях использовать *птушкагадоўля*, в междисциплинарных – *авікультура* с уточнением значения. Согласовать с международными стандартами: при индексировании указывать оба варианта (*aviculture* и *poultry farming*) и предусмотреть перекрёстные ссылки. Избегать некорректного перевода: не использовать aviculture как прямой эквивалент птицеводства в заглавиях и ключевых словах.

Термин **disease management** представляет собой ещё один пример сложной лексической единицы, которая широко используется в международной научной и практической литературе, но при этом отсутствует в национальных нормативных документах, энциклопедиях и специализированных словарях. В международном тезаурусе

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

AGROVOC данный термин закреплён как *кіраванне хваробамі* (бел.) / *управление заболеваниями* (рус.).

В медицинской и ветеринарной литературе *disease management* трактуется как комплекс мероприятий по профилактике, диагностике и лечению хронических заболеваний с использованием систематического подхода и различных методов терапии. Так, Schrijvers определяет его как «интервенцию, направленную на управление или предотвращение хронического состояния с применением системного подхода к уходу и множественных методов лечения» [4].

В аграрной сфере термин приобретает иное содержание. В источниках по растениеводству он описывается как совокупность стратегий и практик, направленных на контроль болезней растений, поддержание качества и количества сельскохозяйственной продукции и обеспечение здоровья людей и животных[1]. При этом подчёркивается необходимость устойчивых методов, минимизирующих негативное воздействие на окружающую среду и нецелевые организмы.

В области животноводства чаще используется близкий по смыслу термин *animal health management*, который определяется как стратегический подход к обеспечению физического и поведенческого здоровья животных. Он включает профилактику заболеваний, вакцинацию, контроль паразитов, мониторинг состояния поголовья и организацию условий содержания, способствующих благополучию животных[2].

---

[1]Plant disease management // ScienceDirect. URL: https://www.sciencedirect.com/topics/agricultural-and-biological-sciences/plant-disease-management (date of access: 15.10.2025).

[2]Словарь терминов Кодекса здоровья наземных животных (Ч. 1) // Управление ветеринарии Орловской области. URL: https://veterinaria57.ru/ournews.php?url=Slovar_terminov_Kodeksa_zdorovya_nazemnyx_zhivotnyx_(chast_1)_2017-09-19 (дата обращения: 15.10.2025).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Таким образом, при попытке закрепить *disease management* в национальном глоссарии возникает методологическая трудность: в разных словарях и справочниках даются отдельные толкования для медицины, растениеводства и животноводства. Универсального определения, охватывающего все сферы, не существует. Для целей глоссария целесообразно зафиксировать базовый вариант *кіраванне хваробамі* с обязательным уточнением области применения (человеческая медицина, агрономия, ветеринария). Такой подход позволит сохранить соответствие международной практике и одновременно учесть специфику тезауруса AGROVOC.

Не менее показательной является ситуация с терминологией в области животноводства. В международном тезаурусе AGROVOC несколько англоязычных терминов переводятся на русский язык одинаково как *животноводство*, хотя их иерархическое положение и смысловое наполнение различаются. Это приводит к потере нюансов и затрудняет точное использование терминологии в научной и практической коммуникации.

Термин *livestock production* в AGROVOC определяется как *животноводство / разведение сельскохозяйственных животных* и отнесён к категории «производство». Он акцентирует внимание на выпуске продукции животноводства — мяса, молока, шерсти и других продуктов. В белорусском языке наиболее адекватным эквивалентом будет *жывёлагадоўчая вытворчасць*. В Современном англо-русском словаре по животноводству [1] данный термин отсутствует, что указывает на разрыв между международной и национальной практикой.

Термин *animal husbandry* в AGROVOC также переводится как *животноводство*, но отнесён к категории «экономические виды деятельности». Это более широкое понятие, включающее организацию содержания, кормления, ухода и разведения животных. В белорусском языке целесообразно закрепить

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

эквивалент *жывёлагадоўля*. В словаре 2012 года *animal husbandry* переводится как *животноводство, животноводческое хозяйство* [1, с. 170], что подтверждает его отраслевой характер.

Термин *animal breeding* в AGROVOC трактуется как *селекция и разведение животных*. Это специализированное понятие, относящееся к генетике и племенной работе. В белорусском языке уместно использовать *селекцыя і развядзенне жывёл*. В словаре 2012 года *animal breeding* переводится как *разведение животных* [1, с. 44], что сужает значение и не отражает селекционного аспекта.

Термин *livestock raising* (или *livestock rearing*) в AGROVOC переводится как *разведение животных (выращивание животных)*. Он акцентирует внимание на процессе выращивания, а не на отрасли или производстве. В белорусском языке возможны варианты *развядзенне жывёл* или *вырошчванне жывёл*. При этом перевод *livestock raising* как *расплоджванне жывёлы* является совсем некорректным, поскольку слово *расплоджванне* в белорусском языке связано в первую очередь с процессом размножения и не всегда охватывает весь комплекс действий по выращиванию и содержанию животных. Его использование приводит к искажению смысла и нарушению терминологической точности.

Термин *livestock breeding* в словаре 2012 года переводится как *скотоводство, животноводство* [1, с. 44]. Этот вариант отсутствует в AGROVOC как отдельная единица, что демонстрирует расхождения между источниками.

Сопоставление AGROVOC, словаря 2012 года и тезауруса ЦНСХБ показывает, что в национальной практике наблюдается тенденция к унификации разных англоязычных терминов под общим словом «животноводство». Это приводит к потере смысловых различий между *livestock production*, *animal husbandry*, *animal breeding* и *livestock raising*. Для белорусскоязычного глоссария необходимо закрепить

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

разграниченные эквиваленты: *livestock production* как *жывёлагадоўчая вытворчасць*, *animal husbandry* как *жывёлагадоўля*, *animal breeding* как *селекцыя і развядзенне жывёл*, *livestock raising* как *развядзенне / вырошчванне жывёл* при обязательном исключении варианта *расплоджванне жывёлы*. Такой подход позволит сохранить точность, согласованность и сопоставимость терминологии в национальной и международной научной коммуникации.

Проведённый анализ показал, что создание белорусскоязычного терминологического глоссария на основе международного тезауруса AGROVOC является не только научной, но и стратегической задачей для развития национальной информационной инфраструктуры. Систематизация и унификация терминов позволяют устранить разночтения, возникающие при переводе и интерпретации профессиональной лексики, а также обеспечивают сопоставимость данных в международном научном пространстве.

Предлагаемые разграниченные белорусские эквиваленты и рекомендации по их закреплению в глоссарии создают основу для формирования единой системы понятий, которая будет учитывать, как международные стандарты, так и национальные языковые особенности.

Таким образом, проект БелСХБ не только восполняет существующие пробелы в терминологической практике, но и способствует укреплению позиций белорусского языка в научной коммуникации, обеспечивая его интеграцию в глобальное информационное пространство.

Список использованных источников:

1. Адаменко, П. А. Современный англо-русский словарь по животноводству : учеб. пособие / П. А. Адаменко, И. В. Вихриева. – СПб. : Проспект Науки, 2012. – 504 с.

2. Saunders comprehensive veterinary dictionary / ed.: V. P. Studdert, C. C. Gay, K. W. Hinchcliff. – 5th ed. – St. Louis : Elsevier, 2021. – 1312 p.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

3. Птицеводство. Термины и определения : ГОСТ Р 58521-2019. – Введ. 03.09.2019. – М. : Стандартинформ, 2019. – 14 с.

4. Schrijvers, G. Disease management: a proposal for a new definition / G. Schrijvers // International Journal of Integrated Care. – 2009. – Vol. 9. – P. 1–6. https://doi.org/10.5334/ijic.317

References:

1. Adamenko P. A., Vikhrieva I. V. *Modern English-Russian dictionary of animal husbandry*. St. Petersburg, Prospekt Nauki Publ., 2012. 504 p.

2. Studdert V. P., Gay C. C., Hinchcliff K. W. (eds.). *Saunders comprehensive veterinary dictionary*. 5th ed. St. Louis, Elsevier, 2021. 1312 p.

3. State Standard R 58521-2019. *Poultry Farming. Terms and definitions*. Moscow, Standartinform Publ., 2019. 14 p. (in Russian).

4. Schrijvers G. Disease management: a proposal for a new definition. *International Journal of Integrated Care*, 2009, vol. 9, pp. 1–6. https://doi.org/10.5334/ijic.317

Дата поступления статьи 16.10.2025
Received 16.10.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННАЯ ТЕРМИНОГРАФИЯ: КЛАССИЧЕСКАЯ И КОМПЬЮТЕРНАЯ

AGRICULTURAL TERMINOGRAPHY: CLASSICAL AND DIGITAL

УДК 81’373.46:001.4=161.3
https://doi.org/10.5281/zenodo.17598128

В. Б. Бабарыка-Амельчанка
Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ДЗЕЙНАСЦЬ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫХ КАМІСІЙ ПА АПРАЦОЎЦЫ БЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ Ў 1921–1930 ГГ.

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца дзейнасць па апрацоўцы сельскагаспадарчай тэрміналогіі, якую вялі тэрміналагічныя камісіі пры Народным камісарыяце асветы БССР, Інстытуце беларускай культуры і Беларускай акадэміі навук у перыяд з1921 па 1930 гады. Выкладзены падыходы да арганізацыі работы камісій, прынцыпы апрацоўкі тэрміналагічнага матэрыялу і тэрмінаграфічныя вынікі, якія ўвасобіліся ў выданні шасці слоўнікаў беларускай тэрміналогіі, звязаных з сельскагаспадарчай галіной. Адзначаецца значнасць праведзенай працы для развіцця аграрнай тэрміналогіі беларускай мовы.

Ключавыя словы: сельскагаспадарчая тэрміналогія, тэрмінаграфія, Інстытут беларускай культуры, Беларуская акадэмія навук, беларуская мова.

Для цытавання. Бабарыка-Амельчанка, В. Б. Дзейнасць тэрміналагічных камісій па апрацоўцы беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі ў 1921–1930 гг. / В. Б. Бабарыка-Амельчанка // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 170–181.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

В. Б. Бабарико-Омельченко

Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ТЕРМИНОЛОГИЧЕСКИХ КОМИССИЙ ПО ОБРАБОТКЕ БЕЛОРУССКОЙ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЙ ТЕРМИНОЛОГИИ В 1921–1930 ГГ.

Аннотация. В статье рассматривается деятельность терминологических комиссий при Народном комиссариате просвещения БССР, Институте белорусской культуры и Белорусской академии наук в период с 1921 по 1930 годы. Излагаются подходы к организации работы комиссий, принципы обработки терминологического материала и терминографические результаты, которые воплотились в издании шести словарей белорусской терминологии, связанных с сельскохозяйственной отраслью. Отмечено значение проведённой работы для развития аграрной терминологии белорусского языка.

Ключевые слова: сельскохозяйственная терминология, терминография, Институт белорусской культуры, Белорусская академия наук, белорусский язык.

V. B. Babaryka-Amelchanka

I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

THE ACTIVITIES OF TERMINOLOGICAL COMMISSIONS ON THE DEVELOPMENT OF BELARUSIAN AGRICULTURAL TERMINOLOGY DURING 1921–1930

Abstract. The article examines the activities of the terminological commissions under the People's Commissariat of Education of the BSSR, the Institute of Belarusian Culture, and the Belarusian Academy of Sciences during the period from 1921 to 1930. The approaches to organizing the work of the commissions, the principles of processing terminological material, and the terminographic results are presented, which were embodied in the publication of six dictionaries of Belarusian terminology related to the agricultural sector. The significance of the work carried out for the development of agricultural terminology in the Belarusian language is noted.

Keywords: agricultural terminology, terminography, Institute of Belarusian Culture, Belarusian Academy of Sciences, Belarusian language.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

For citation. Babaryka-Amelchanka V. B. The activities of terminological commissions on the development of Belarusian agricultural terminology during 1921–1930. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 170–181 (in Belarusian).

З развіццём беларусізацыі на пачатку 1920-х гг. сфера функцыянавання беларускай мовы значна пашырылася. Арганізацыя сярэдняй і вышэйшай школы, стварэнне нацыянальнага перыядычнага друку, падрыхтоўка школьных падручнікаў, перакладчыцкая дзейнасць, вядзенне афіцыйнага справаводства, развіццё навуковых даследаванняў патрабавалі хуткага развіцця і ўдасканалення беларускай мовы. Важным крокам у гэтай справе была распрацоўка мінімуму тэрміналогіі, неабходнага для выкладання на роднай мове ў сярэдняй школе, стварэння праграм, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў.

У лютым 1921 г. Навукова-літаратурным аддзелам Народнага камесарыята асветы БССР была створана Беларуская навукова-тэрміналагічная камісія. Менавіта ад гэтай падзеі прынята весці перадгісторыю Інстытута беларускай культуры.

Першапачаткова мэтай дзейнасці навукова-тэрміналагічнай камісіі з’яўлялася апрацоўка беларускай тэрміналогіі па ўсіх галінах ведаў у аб’ёме сярэдняй школы. Аднак ужо цягам некалькі месяцаў было відавочна, што камісія павінна распрацоўваць беларускую тэрміналогію шырэй і паўней: да яе кампетэнцыі было аднесена апрацаванне праўнай тэрміналогіі, тэхнічнай, сельскагаспадарчай і іншай. У чэрвені 1921 г. Беларуская навукова-тэрміналагічная камісія ўвайшла ў навуковую групу ўтворанага Акадэмічнага цэнтра Наркамасветы БССР і была падзелена на тры секцыі: гуманітарных, прыродазнаўчых і матэматычных навук. У кожную секцыю ўвайшлі адпаведныя спецыялісты [1, с. 11].

Адзначаючы існуючыя дасягенні ў развіцці беларускай мовы і літаратуры, заснавальнік беларусазнаўства Яўхім Фёдаравіч

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Карскі ў сваім артыкуле «Что предстоит сделать по белорусскому языку и литературе?» (“Вестник Народного Комиссариата Просвещения”, 1921 № 1) зазначаў, што “по языку ещё предстоит огромная задача составления полного белорусского словаря”. Уяўляючы складаны шлях дасяжэння гэтай мэты, Я.Ф. Карскі заклікае да супольнай працы над поўным беларускім слоўнікам знаўцаў і аматараў беларускага слова і прапануе праграму дзеянняў у гэтым накірунку. Сярод неабходных захадаў па стварэнні слоўніка жывой беларускай мовы ён заўважае, што для поўнасці такога слоўніка неабходна ўключэнне “названий для растений ботанических, названий животных, птиц, рыб, насекомых, пресмыкающихся, минералогических и некоторых химических названий, специальных технических терминов. Их необходимо записать непосредственно из уст народа. … Во избежание недорозумений при названиях растений и животных необходимо приводить русский перевод, а кто знает и латинское название” [2, с. 26–27].

Парадак працы па ўкладанні тэрміналогіі уключаў наступныя стадыі:

– кожны з членаў секцыі браў на сябе апрацоўку тэрміналогіі па пэўнай галіне;

– праект тэрміналогіі на некалькіх мовах прадстаўляўся на раздгяд адпаведнай секцыі (некаторыя праекты падавліся на разгляд секцый не членамі камісіі);

– прынятая секцыяй тэрміналогія зацвярджалася агульным сходам, які складаўся з усіх членаў камісіі. Звачайна агульны сход прымаў тэрміналогію аднагалосна, пры спрэчных словах рашэнне прымалася большасцю 3/4 прысутных на сходзе. Такім чынам, кожны праект тэрміналогіі праходзіў праз двайную экспертызу, што забяспечывала большую грунтоўнасць, а таксама атрыманне пэўнай згоднасці паміж працаю ўсіх секцый [1, с. 11].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

На старонках 2-га нумара “Вестника Народного Комиссариата Просвещения” у раздзеле “Беларускі аддзел”, былі прадстаўлены першыя вынікі працы навукова-тэрміналагічнай камісіі па апрацоўцы тэрміналогіі (граматычная тэрміналогія). Усяго на працягу выхаду “Вестника” у 1921–1922 гг. было надрукавана сем выпускаў беларускай навуковай тэрміналогіі, сярод іх – 5-ты выпуск, прысвечаны батанічнай тэрміналогіі, якая натуральна звязана з сельскагаспадарчай галіной.

Батанічная тэрміналогія, апублікаваная ў выпуску 5–6 (май–чэрвень) “Вестника Народного Комиссариата Просвещения” за 1922 г. (агульны вып. 7–8) складалася з расійска-беларускага тэкста, які ўтрымліваў і лацінскія найменні, і ўключала 451 тэрмін [3].

Што тычыцца характару тэрміналогіі, то пры яе апрацоўцы камісія прытрымлівалася агульных прынцыпаў для ўсіх галін [1].

Галоўным прынцыпам працы камісіі было ўвядзенне слоў, якія бытавалі ў жывой народнай мове: *хмызняк* (заросль), *насеньне* (семена), *вільгаць* (влажность), *глеба* (почва).

Другі напрамак – стварэнне неалагізмаў шляхам шырокага прымянення на базе нацыянальнай мовы афіксальнага словаўтварэння, аснова- і словаскладання, калькавання, семантычнага перакладу: *голанасенныя* (голосемянные), *павойныя* (вьюнковые), *алеістыя расліны* (масленистые растения), *каморка* (клетка), *суквецце* (соцветие). У некаторых выпадках камісія прымала два беларускіх тэрміна, у выпадках, калі такія словы часта ўжываюцца ў жывой народнай мове, альбо як кампраміс пры спрэчных тэрмінах: *кветка* і *краска* (цветок), *ігліца* і *шыльнік* (хвоя), *булаўка* і *кіёўка* (початок).

Іншамоўныя тэрміны ўжываліся вельмі рэдка і, як правіла, у выпадках, калі ў народнай мове не было адпаведнага беларускага тэрміна. Бывала і так, што даваўся беларускі тэрмін і побач з ім іншамоўнае слова (калі беларускі тэрмін не зусім дакладна

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

выражаў паняцце): *скурка* і *эпідэрміс* (эпидермис), *хлёрофіль* і *лістазелень* (хлорлофил), *надскурка* і *кутыкуля* (надкожица).

З утварэннем Інбелкульта працягам працы Навукова-тэрміналагічнай камісіі па апрацоўцы тэрміналогіі сельскагаспадарчай галіны займаюцца тэрміналагічныя камісіі пры яго прыродазнаўчай секцыі, лясной падсекцыі сельскагаспадарчай секцыі, галоўнай тэрміналагічнай камісіі, пры Навуковым таварыстве для вывучэння Беларусі ў Горках (установа Інбелкульта), а пасля ўтварэння Беларускай акадэміі навук – тэрміналагічная камісія Інстытута мовазнаўства. Вынікам дзейнасці вышэйназваных камісій стала выданне шасці слоўнікаў беларускай навуковай тэрміналогіі, звязаных з сельскагаспадарчай галіной.

Шосты выпуск беларускай навуковай тэрміналогіі *“Батаніка: агульная і спэцыяльная”* быў падрыхтаваны прыродазнаўчай секцыяй Інстытута беларускай культуры ў 1924 годзе [4]. Выданне ўтрымлівае расійска-беларускі і лацінска-расійска-беларускі слоўнікі і складаецца з двюх частак:

1) агульная батаніка (анатомія, марфалогія і фізіялогія раслін) прадстадстаўлена расійска-беларускім слоўнікам (580 тэрмінаў, прычым беларуская частка крыху большая за рускую, бо некаторым рэестравым словам прапануецца два беларускія эквіваленты) і двух паказчыкаў – лацінскіх (102) і беларускіх тэрмінаў;

2) спецыяльная батаніка (сістэматыка раслін) складаецца з лацінска–расійска–беларускага слоўніка (1 248 тэрмінаў), у якім назвы сем’яў, відаў і родаў сустракаемых і агульнавядомых у Буларусі раслін размешчаны ў алфавітным парадку, а таксама двух паказчыкаў тэрмінаў – расійскіх і беларускіх назваў.

Як зазначаецца у прадмове, увесь праект тэрміналогіі быў падрыхтаваны дырэктарам Мінскай балотнай станцыі, сябрам Інбелкульту, Вітольдам Міхальскім. На працягу 1922–1923 гг. праект быў перегледжаны і прыняты прыродазнаўчай секцыяй і

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

часткова заслуханы на пленуме Інбелкульту. Найбольш значны ўдзел у працы па пераглядзе прымалі сябры Інбелкульту Сцяпан Некрашэвіч, Мікалай Азбукін, Міхаіл Грамыка, Аляксандр Круталевіч, Часлаў Родзевіч і Аркадзь Смоліч. Агульная батаніка, як узгадавалася вышэй, ужо была надрукавана ў вып. 7–8 “Вестника Народного Комиссариата Просвещения” (1922 г.). Папраўкі і дадаткі ў гэтую частку, як і ўпарадкаванне, тэхнічнае рэдагаванне абодзвюх частак, укладанне паказчыкаў выканаў А. Смоліч.

“Слоўнік лясных тэрмінаў”, выдадзены ў 1926 годзе, стаў восьмым выпускам беларускай навуковай тэрміналогіі падрыхтаванай Інстытутам беларускай культуры [5]. Слоўнік быў складзены тэрміналагічнай камісіяй лясной падсекцыіі Інбелкульта, у якой працавалі члены падсекцыі Язэп Троська, Якуб Шамоль, Амбр. Хацяновіч, Часлаў Бялюнас і П. Санько, канчатковая рэдакцыя была зацверджана правапісна-тэрміналагічнай камісіяй Інбелкульта. У выданні былі сабраныя тэрміны, якія ўжываюцца як у асобных галінах лясной навукі, так і ў канцылярыі лясніцтва. Слоўнік складаецца з дзвюх частак: расійска–беларускі слоўнік (1 657 рускамоўных тэрмінаў) і паказчык беларускіх тэрмінаў у алфавітным парадку.

Дванаццаты выпуск беларускай навуковай тэрміналогіі Інстытута беларускай культуры *“Назовы жывёл”* выйшаў у 1927 годзе [6]. Выданне складаецца з лацінска–расійска–беларускага слоўніка (1 037 лацінскіх тэрмінаў), у якім назвы пераважна тых жывёл, якія сустракаюцца ў межах Беларусі і тых, якія ўзгадваюцца ў элементарных падручніках па прыродазнаўстве размешчаны ў алфавітным парадку, а таксама з двух паказчыкаў – расійскіх і беларускіх тэрмінаў. У прадмове даюцца друкаваныя крыніцы, якія выкарыстоўваліся пры ўкладанні праекта (слоўнік Насовіча, “Маскоўска-Крыўскі слоўнік” Ластоўскага, “Рыбы пресноводных вод России” Л. С. Берга, “Птицы России. Изд. 2.” М. А. Мензбіра і інш.), і зазначаецца, што складзены

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

М. Азбукіным праект быў разгледжаны спецыяльнай тэрміналагічнай камісіяй прыродазнаўчай секцыі, пераглежданы правапісна-тэрміналагічнай камісіяй Інбелкульту і зацверджаны да выдання Прэзідыумам прыродазнаўчай секцыі.

“Слоўнік глебазнаўчае тэрмінолёгіі (праект)” стаў шаснаццатым выпускам падрыхтаванай у 1927 годзе беларускай навуковай тэрміналогіі [7]. Ён складаецца з руска–беларуска–нямецкага слоўніка (832 рускамоўных тэрміна) і паказчыка беларускіх тэрмінаў. У прадмове ўкладальнік глебазнаўчай тэрміналогіі П. Кучынскі, аспірант пры глебазнаўчай кафедры Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, коратка распавядае аб своёй працы па складанні тэрміналогіі (адбор і запіс расійскіх тэрмінаў з лепшых глебазнаўчых выданняў; узгадненне з ужо надрукаванай Інбелкультам тэрміналогіяй; укладанне беларускай тэрміналогіі – пошук адпаведнікаў у жывой народнай мове або пакіданне міжнароднай формы ў беларускай транскрыпцыі; укладанне нямецкай часткі) і дае спіс выкарыстанай літаратуры. Праект быў перагледжаны, выпраўлены і ўхвалены да друка Галоўнай тэрміналагічнай камісіяй Інбелкульта.

Дзевятнаццаты выпуск беларускай навуковай тэрміналогіі *“Слоўнік сельскага-спадарчае тэрмінолёгіі (проект)”* быў надрукаваны ў 1928 годзе [8]. Выданне складаецца з расійска–беларускага слоўніка (1 674 рускіх тэрміна) і паказчыка беларускіх тэрмінаў. У прадмове падкрэсліваецца, што пры апрацоўцы сельскагаспадарчай тэрміналогіі існуе шмат асаблівасцей і складанасцей, звязаных з дыялектнай разнастайнасцю народнай мовы і стварэннем новых тэрмінаў для азначэння пэўных паняццяў, тым не менш, адзначаецца тэрміновая неабходнасць выдання слоўніка, нягледзячы на непаўнату і недасканаласць. Тэрміналогія была апрацавана асобнай тэрміналагічнай камісіяй, якая была ўтворана замест былой сельскагаспадарчай секцыі ў складзе аграномаў

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Я. Грабоўскага, Я. Кіслякова, М. Лайкова, П. Рагавога і А. Смоліча, пры ўдзеле тэрміналагічных камісій пры Навуковым таварыстве для вывучэння Беларусі ў Горках. Праект перагледжаны і зацверджаны Галоўнай тэрміналагічнай камісіяй Інстытута навуковай мовы Інбелкульта.

“Слоўнік тэрміналёгіі агульнае расьлінагадоўлі (праект)” увасобіўся ў дваццаць чацвёртым выпуску беларускай навуковай тэрміналогіі, якая вышла ў 1930 годзе [9]. Слоўнік скаладаецца з расійска–беларускага слоўніка (2 092 рускіх тэрміна) і паказчыка беларускіх тэрмінаў і мае спіс выкарыстанай пры ўкладанні літаратуры з 44 крыніц. Тэрміналогія апрацавана тэрміналагічнай камісіяй Інстытута мовазнаўства Беларускай акадэміі навук і апублікавана з дазволу яе Прэзідыума.

Ва ўступных словах кожнага з вышэйразгледжаных слоўнікаў адзначаецца праектны характар выдадзеных тэрміналогій, выказваецца намер далейшай працы ў накірунках выяўлення народнага матэр’ялу, яго апрацавання і ўпарадкавання, а таксама ўтрымліваецца зварот ад імя тэрміналагічнай камісіі да ўсіх зацікаўленых асоб і ўстаноў далучыцца да актыўнай працы па ўдасканаленні беларускай навуковай тэрміналогіі.

Характэрнай асаблівасцю тэрміналогіі, распрацаванай тэрміналагічнымі камісіямі ў 1921–1930 гг., была высокая ступень варыятыўнасці, абумоўленая перш за ўсё падачай часткі запазычаных тэрмінаў разам з беларускімі лексемамі або неалагізмамі. Імкненне ўкладальнікаў тэрміналагічных выпускаў максімальна выкарыстаць беларускія эквіваленты тлумачыцца не толькі прытрымліваннем нацыянальнай чысціні мовы, але і даволі часта тым, што на раннім этапе развіцця навукі ў Беларусі вучоныя і папулярызатары навукі ў сваіх публікацыях навуковага і навукова-папулярнага зместу часта выкарыстоўвалі замест невядомых шырокаму колу чытачоў запазычаных тэрмінаў словы жывой беларускай мовы, а часам і вузкія рэгіяналізмы, якія і былі зафіксаваны ўкладальнікамі выпускаў. Акрамя таго,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

аналагічнымі матывамі часам кіраваліся і самі ўкладальнікі пры неабходнасці выбару паміж запазычаннем і словам жывой народнай мовы. З гэтага боку апрацоўка тэрміналогіі, звязанай з сельскагаспадарчай галіной, у імкненні да выкарыстання сродкаў нацыянальнай мовы ў цэлым не мела значных крайнасцей, бо беларуская мова мае вельмі багаты запас сельскагаспадарчых і роднасных назваў і тэрмінаў.

Такім чынам, тэрміналагічныя камісіі, якія працавалі спачатку пры Народным камісарыяце асветы БССР, затым, з 1922 па 1929 г., – у Інстытуце беларускай культуры, а ў 1929–1930 гг. – у Беларускай акадэміі навук, правялі вялікую работу па ўпарадкаванні беларускай навуковай тэрміналогіі. Шэсць слоўнікаў беларускай тэрміналогіі, звязанай з сельскагаспадарчай галіной, былі выдадзены агульным накладам 5 750 асобнікаў. Агульная колькасць тэрмінаў, уключаных у гэтыя выданні склала больш за 9 тыс. Нягледзячы на некаторыя дубліраванні тэрмінаў у слоўніках роднаснай тэрміналогіі, праведзеная тэрміналагічнымі камісіямі навуковая праца па беларускай лексікалогіі заклала грунтоўны падмурак далейшага развіцця аграрнай тэрміналогіі.

Тэрмінаграфічная спадчына, створаная тэрміналагічнымі камісіямі ў 1921–1930 гг., і сёння захоўвае навуковую значнасць для розных галін ведаў. Да таго ж паляпшаецца яе агульная даступнасць: у 2010 годзе пабачыла свет перавыданне 24 выпускаў беларускай навуковай тэрміналогіі у выглядзе 2-га стэрэатыпнага выдання ў 4-х кнігах (шэсць слоўнікаў беларускай тэрміналогіі, звязанай з сельскагаспадарчай галіной, уключаны ў кнігі 1–3) [10], ствараюцца лічбавыя копіі арыгінальных выданняў і забеспячваецца вольны доступ да іх у інтэрнэце. Гэта, безумоўна, спрыяе ракрыццю нацыянальных моўных традыцый, а таксама развіццю сучаснай беларускай тэрміналогіі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Беларуская навуковая тэрміналогія // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. – 1921. – № 2. – С. 11–13 (2-я паг.).

2. Карский, Е. Ф. Что предстоит сделать по белорусскому языку и литературе? / Е. Ф. Карский // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. – 1921. – № 1. – С. 25–28.

3. Беларуская навуковая тэрміналогія (працяг). Батанічная тэрміналогія // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. – 1922. – № 5–6. – С. 13–21 (2-я паг.).

4. Батаніка: агульная і спецыяльная : [рас.-бел. і лац.-рас.-бел. слоўн.] / Ін-т бел. культуры, Прыродазн. секцыя. – Мн. : Ін-т бел. культуры, 1924. – 83 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 6).

5. Слоўнік лясных тэрмінаў : [рас.-бел. слоўн.] / Ін-т бел. культуры, С.-г. секцыя. – Мн. : Ін-т бел. культуры, 1926. – 79 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 8).

6. Назвы жывёл : [лац.-рас.-бел. слоўн.] / Ін-т бел. культуры, Прыродазн. секцыя. – Мн. : Ін-т бел. культуры, 1927. – 71 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 12).

7. Слоўнік глебазнаўчай тэрміналогіі : (праект) : [рас.-бел.-ням. слоўн.] / Ін-т бел. культуры, Аддз. мовы і літ., Гал. тэрмінал. каміс. – Мн. : Ін-т бел. культуры, 1927. – 62 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 16).

8. Слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі : (праект) : [рас.-бел. слоўн.] / Ін-т бел. культуры, Аддз. мовы і літ., Ін-т навук. мовы. – Мн. : Ін-т бел. культуры, 1928. – 76 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 19).

9. Слоўнік тэрміналогіі агульнай раслінагадоўлі : (праект) : [рас.-бел. слоўн.] / Бел. акад. навук, Тэрмінал. каміс. Ін-ту мовазнаўства. – Мн. : [б. в.], 1930. – 100 с. – (Беларуская навуковая тэрміналогія ; вып. 24).

10. Беларуская навуковая тэрміналогія : у 4 кн. – Выд. 2-е, стэр. – [Мн.? : б. в.], 2010. – 4 кн.

References:

1. Belarusian scientific terminology. *Vestnik Narodnogo Komissariata Prosveshcheniya SSRB* [Bulletin of the People's Commissariat of Education of the SSRB], 1921, no. 2, pp. 11–13 (in Belarusian).

2. Karskii E. F. What remains to be done in the Byelorussian language and literature? *Vestnik Narodnogo Komissariata Prosveshcheniya SSRB* [Bulletin of the

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

People's Commissariat of Education of the SSRB], 1921, no. 1, pp. 25–28 (in Russian).

3. Belarusian scientific terminology (continuation). Botanical terminology. *Vestnik Narodnogo Komissariata Prosveshcheniya SSRB* [Bulletin of the People's Commissariat of Education of the SSRB], 1922, no. 5–6, pp. 13–21 (in Belarusian).

4. Institute of Belarusian Culture. *Botany: general and special. Belarusian Scientific Terminology. Issue 6.* Minsk, Institute of Belarusian Culture, 1924. 83 p. (in Belarusian).

5. Institute of Belarusian Culture. *Dictionary of forest terms. Belarusian Scientific Terminology. Issue 8*. Minsk, Institute of Belarusian Culture, 1926. 79 p. (in Belarusian).

6. Institute of Belarusian Culture. *Names of animals. Belarusian Scientific Terminology. Issue 12*. Minsk, Institute of Belarusian Culture, 1927. 71 p. (in Belarusian).

7. Institute of Belarusian Culture. *Dictionary of soil science terminology: (draft). Belarusian Scientific Terminology. Issue 16*. Minsk, Institute of Belarusian Culture, 1927. 62 p. (in Belarusian).

8. Institute of Belarusian Culture. *Dictionary of agricultural terminology: (draft). Belarusian Scientific Terminology. Issue 19*. Minsk, Institute of Belarusian Culture, 1928. 76 p. (in Belarusian).

9. Belarusian Academy of Sciences. *Dictionary of general plant growing terminology: (draft). Belarusian Scientific Terminology. Issue 24*. Minsk, 1930. 100 p. (in Belarusian).

10. *Belarusian scientific terminology: in 4 books*. 2nd ed. Minsk, 2010. 4 books. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 13.10.2025
Received 13.10.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 81’374:34
https://doi.org/10.5281/zenodo.17598147

І. Л. Капылоў, Н. В. Паляшчук, Э. В. Ярмоленка

Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

АБ СТВАРЭННІ НОВАГА РУСКА-БЕЛАРУСКАГА СЛОЎНІКА ЮРЫДЫЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

Анатацыя. У артыкуле апісаны прынцыпы ўкладання новага руска-беларускага слоўніка юрыдычных тэрмінаў, падрыхтоўка якога вядзецца на матэрыяле дзеючых адзінаццаці кодэксаў Рэспублікі Беларусь, акрэслены перспектывы яго практычнага выкарыстання ў сферы заканадаўства, права, справаводства, мовазнаўства і інш.

Ключавыя словы: кодэкс, юрыдычны тэрмін, юрыдычная тэрміналогія, перакладная тэрмінаграфія, руска-беларускі слоўнік.

Для цытавання. Капылоў, І. Л. Аб стварэнні новага руска-беларускага слоўніка юрыдычных тэрмінаў / І. Л. Капылоў, Н. В. Паляшчук, Э. В. Ярмоленка // Актуальные проблемы сельскохозяйственной терминологии : доклады Международной научной конференции, Минск, 27 ноября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Институт языкознания им. Якуба Коласа ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 182–192.

И. Л. Копылов, Э. В. Ермоленко, Н. В. Полещук

Институт языкознания имени Якуба Коласа Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси, Минск, Беларусь

О СОЗДАНИИ НОВОГО РУССКО-БЕЛОРУССКОГО СЛОВАРЯ ЮРИДИЧЕСКИХ ТЕРМИНОВ

Аннотация. В статье описаны принципы составления нового русско-белорусского словаря юридических терминов, подготовка которого ведется на материале действующих одиннадцати кодексов Республики Беларусь, обозначены перспективы его практического использования в сфере законодательства, права, делопроизводства, языкознания и др.

Ключевые слова: кодекс, юридический термин, юридическая терминология, переводная терминография, русско-белорусский словарь.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Ihar L. Kapylou, Elvira V. Yarmolenka, Natallia V. Paliashchuk

Yakub Kolas Institute of Linguistics of the Centre for Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

ON THE CREATION OF A NEW RUSSIAN-BELARUSIAN DICTIONARY OF LEGAL TERMS

Abstract. The article describes the principles for compiling a new Russian-Belarusian dictionary of legal terms, which is being developed using eleven current codes of the Republic of Belarus. It also outlines the prospects for its practical use in legislation, law, office work, linguistics, and other fields.

Keywords: code, legal term, legal terminology, translation terminology, Russian-Belarusian dictionary.

For citation. Kapylou I. L., Palaschuk N. V., Yarmolenka E. V. On the creation of a new Russian-Belarusian dictionary of legal terms. Actual problems of agricultural terminology : proceedings of the International scientific conference, Minsk, November 27, 2025. Minsk, 2025, pp. 182–192 (in Belarusian).

З пачатку XX ст. вывучэнне юрыдычнай тэрмінасістэмы беларускай мовы айчыннымі мовазнаўцамі вядзецца ў наступных напрамках: аналіз развіцця юрыдычнай лексікі і тэрміналогіі ў XIV – першай палавіне XVIII стагоддзя (А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, В. Э. Зіманскі, М. А. Новік, Н. В. Паляшчук); даследаванне іх дынамікі ў першай палавіне XX стагоддзя (С. Я. Богуш, Г. І. Кулеш); разгляд колькаснага і якаснага складу юрыдычнай тэрміналогіі і яе функцыянавання ў другой палавіне XX – першай чвэрці XXI стагоддзя (М. Г. Антанюк, М. У. Буракова, Г. І. Кулеш); аналіз перакладу юрыдычнай лексікі з рускай мовы на беларускую мову і яе рэпрэзентацыі ў лексікаграфічных выданнях (Г. І. Кулеш, А. М. Лапцёнак). Таксама сёння ўвага павінна быць скіравана і на вырашэнне такіх пытанняў, як выпрацоўка навукова абгрунтаваных патрабаванняў да мовы заканадаўства на падставе вывучэння нацыянальных стылеўтваральных рэсурсаў наяўных беларускамоўных юрыдычных тэкстаў; тэрміналагічнае,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

перакладчыцкае і тэрмінаграфічнае забеспячэнне юрыдычнай дзейнасці; лінгвістычная адукацыя спецыялістаў у галіне права і падрыхтоўка філолагаў для лінгвістычнай экспертызы заканадаўчых тэкстаў [гл.: 1].

Неабходнасцю сістэматызацыі і кадыфікацыі тэрміналогіі права, змены ў якой звязаны з экстралінгвістычнымі фактарамі, абумоўлена з'яўленне серыі юрыдычных слоўнікаў, сярод якіх "Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік" (Мінск, 1992); "Краткий русско-белорусско-английский словарь для юридических институтов и факультетов" (М. О. Лойка, І. І. Штоп. Гродна, 1997); "Краткий русско-белорусский словарь юридических и социально-экономических терминов" (Т. В. Кузьмянкова. Мінск, 2009), "Краткий русско-белорусский словарь юридической лексики" (Т. І. Скікевіч, Г. І. Малько, С. П. Дабіжы. Горкі, 2016), "Французска-беларускі слоўнік прававой лексікі" (І. Г. Баўтрэль, Я. В. Волкава, А. А. Завадская і інш. Мінск, 2019), "Шматмоўны слоўнік юрыдычных тэрмінаў" (http://multilang.pravo.by/ru) і інш. Акрамя таго, юрыдычная лексіка прадстаўлена ў шэрагу вучэбных дапаможнікаў па дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)", напрыклад, "Беларуская мова. Юрыдычная лексіка" Т. М. Смольскай і Л. У. Хрышчановіч (Мінск, 2011), "Беларуская мова. Юрыдычная лексіка" В. К. Мароз, А. В. Каценка (Мінск 2018).

Новы руска-беларускі слоўнік юрыдычных тэрмінаў упершыню рыхтуецца на матэрыяле дзеючых адзінаццаці кодэксаў Рэспублікі Беларусь (Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Лясны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Кодэкс гандлёвага мараплаўства Рэспублікі Беларусь, Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў, Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі), што дазволіць *максімальна поўна* прадставіць ужывальную ў сучаснай прававой, заканадаўчай, справаводчай практыцы юрыдычную лексіку і тэрміналогію.

Праца над слоўнікам вядзецца паэтапна: спачатку ствараюцца асобныя даведнікі па пэўным відзе права (напрыклад, слоўнік тэрміналогіі экалагічнага права распрацоўваецца на аснове Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь і Лясного кодэкса Рэспублікі Беларусь, працоўнага права – на аснове Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і інш.), якія затым будуць аб'яднаны ў зводны руска-беларускі слоўнік юрыдычных тэрмінаў; пасля распрацоўкі адпаведнага праграмнага забеспячэння ім можна будзе карыстацца ў анлайн-рэжыме. Такім чынам, новы лексікаграфічны даведнік дапоўніць серыю перакладных і тлумачальных слоўнікаў спецыяльнай лексікі беларускай мовы, у тым ліку і юрыдычнай, павялічыць факталагічную базу для вырашэння пытанняў упарадкавання і кадыфікацыі беларускай нацыянальнай тэрміналогіі, паспрыяе стандартызацыі юрыдычнай тэрмінасістэмы, уніфікаванаму выкарыстанню тэрмінаў у спецыяльнай літаратуры, перыядычным друку і інш.

Пры стварэнні новага руска-беларускага слоўніка юрыдычных тэрмінаў улічаны вопыт іх лексікаграфавання беларускімі і замежнымі вучонымі [гл., напрыклад: 2, 3, 4, 5, 6].

Праца будзе складацца з прадмовы, рэкамендацый па карыстанні слоўнікам, спіса прынятых скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, слоўнікавых артыкулаў, дадатку.

У слоўніку прыняты алфавітна-гнездавы прынцып размяшчэння слоў. Рэестр складаюць аднаслоўныя і неаднаслоўныя адзінкі на рускай мове ў алфавітным парадку (яны падаюцца з малой літары паўтлустым шрыфтам).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Аднаслоўныя тэрміны прадстаўлены ў пачатковай форме (форма назоўнага склону адзіночнага ліку для назоўнікаў, назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду для прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, інфінітыва для дзеясловаў). Неаднаслоўныя назвы падаюцца паводле пачатковай формы галоўнага слова.

вода вада *ж.*[1]

возрастная структура древостоя ўзроставая структура дрэвастою

питомник гадавальнік *м.*

ликвидировать ліквідаваць

обязательный для соблюдения абавязковы для выканання

соблюдать 1) выконваць; 2) захоўваць

Для некаторых тэрміналагічных адзінак у якасці рэестравай абіраецца форма множнага ліку як найбольш ужывальная:

отходы адходы *мн.*

питьевые нужды пітныя патрэбы

поливомоечные работы палівальна-мыйныя работы

потери воды страты вады

Пры аднаслоўных тэрмінах-назоўніках указваецца род (*м., ж., ср.*/*н.*), калі ён супадае ў рускай і беларускай лексемы – пасля беларускага эквівалента, калі не супадае – пасля кожнага слова:

животное *ср.* жывёла *ж.*

пруд *м.* сажалка *ж.*

пруд-испаритель *м.* сажалка-выпарнік *ж.*

пруд-копань *м.* сажалка-копанка *ж.*

пруд-усреднитель *м.* сажалка-ўсярэднівальнік *ж.*

Тэрміналагічныя спалучэнні ў складзе прыметніка / дзеепрыметніка і назоўніка падаюцца двойчы: у алфавітным парадку па першай літары залежнага слова (прыметніка /

[1]Тут і далей прыклады прыведзены з Воднага Кодэкса Рэспублікі Беларусь і Ляснога Кодэкса Рэспублікі Беларусь, на аснове якіх ужо падрыхтаваны рукапіс слоўніка тэрмінаў экалагічнага права.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

дзеепрыметніка) і ў гняздзе пры галоўным слове (назоўніку). Так, напрыклад, тэрмін **сельское хозяйство** падаецца на сваім месцы па алфавіце на літару «С» і пад літарай «Х» у гняздзе слова **хозяйство**, якое з'яўляецца галоўным і апорным для шэрага пададзеных пры ім састаўных тэрміналагічных адзінак:

сельское хозяйство сельская гаспадарка

хозяйство *н.* гаспадарка *ж.* ...

сельское х. сельская гаспадарка

Неаднаслоўныя тэрміны пад загалоўным словам гнязда размяшчаюцца па алфавіце з новага радка. Замест паўтору загалоўнага слова ў рускай частцы падаецца першая яго літара з кропкай (калі яно мае ў выразе пачатковую форму; у іншых выпадках – слова падаецца поўнасцю). У беларускай частцы словы не скарачаюцца:

рубка высечка *ж.*

выборочная р. выбарачная высечка

выборочная санитарная р. выбарачная санітарная высечка

длительно-постепенная р. працягла-паступовая высечка

незаконная р. незаконная высечка

прочие рубки іншыя высечкі

р. главного пользования высечка галоўнага карыстання

Калі руская лексема перакладаецца рознымі па значэнні адзінкамі, то яны даюцца пад парадкавымі нумарамі праз кропку з коскай. Далей з абзаца прыводзяцца тэрміналагічныя выразы ў алфавітным парадку ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення выразаў пасля загалоўнага слова гнязда:

защита 1. абарона; 2. ахова *ж.*

з. водоносных горизонтов ахова ваданосных гарызонтаў

з. населения абарона насельніцтва

з. населения и территорий абарона насельніцтва і тэрыторый

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

з. прав и законных интересов абарона правоў і законных інтарэсаў

з. растений абарона раслін

изъятие *ср.* 1. забор *м.*; 2. адабранне *ср.*

и. вод забор вод;

и. поверхностных вод забор паверхневых вод;

и. поверхностных водных объектов адабранне паверхневых водных аб'ектаў

Тэрміны-амонімы абазначаюцца надрадковымі арабскімі лічбамі:

образование[1] *н.* адукацыя *ж.*

образование[2] утварэнне *н.*

Акрамя тэрмінаў, у слоўнік уключаны найбольш частотныя ў кодэксах лексічныя адзінкі і ўстойлівыя выразы тыпу *внесение изменений и (или) дополнений*, *во избежание*, *принять меры*, *по мнению*, *с целью*, *требовать*:

выполнение требований выкананне патрабаванняў

на основании на падставе

на условиях на ўмовах

Укладанне рукапісу слоўніка тэрмінаў грунтуецца на ўліку вынікаў супастаўляльнага даследавання юрыдычных тэрмінасістэм беларускай і рускай моў і асноўных прынцыпаў тэорыі перакладу з адной мовы на іншую.

Пры перакладзе тэрмінаў з рускай мовы на беларускую выкарыстаны лексічныя адзінкі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Гэта накіравана на стабілізацыю моўных нормаў і захаванне адзінага моўнага рэжыму ў Рэспубліцы Беларусь.

Пры наяўнасці эквівалентных лексічных адзінак (эквівалентам лічыцца пастаянны раўназначны адпаведнік) мэтазгодна карыстацца толькі імі:

озеро возера *н.*

пруд *м.* сажалка *ж.*

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Пры адпаведнасці слову рускай мовы некалькіх слоў у беларускай мове выбар адпаведніка вызначаецца кантэкстам, у якім рэалізуецца семантыка слова, якое перакладаецца, частотнасцю і традыцыяй яго выкарыстання, напрыклад:

изъятие *ср*. 1. забор *м*.; 2. адабранне *ср*.

и. вод забор вод…

и. поверхностных водных объектов адабранне паверхневых водных аб'ектаў

решение Минского городского исполнительных комитета рашэнне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта

решение экологических проблем вырашэнне экалагічных праблем

Калі слова рускай мовы, якое перакладаецца, не зафіксавана перакладнымі лексікаграфічнымі даведнікамі беларускай мовы, то разглядаецца яго семантыка і прапаноўваецца яго беларускамоўны адпаведнік, напрыклад:

водорегулирующие устройства водарэгулюючыя прылады

водорегулирующие сооружения водарэгулюючыя збудаванні

добываемые подземные воды здабываемыя падземныя воды

изымаемые поверхностные воды забіраемыя паверхневыя воды

Дадатак да слоўніка ўключае пералік уласных назваў на рускай мове і іх адпаведнікі на беларускай мове, што будзе садзейнічаць іх аднолькавай перадачы:

Белорусское республиканское общество спасания на водах Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах

Водный кодекс Республики Беларусь Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь

Государственная граница Республики Беларусь Дзяржаўная граніца Рэспублікі Беларусь

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Государственная инспекция охраны животного и растительного мира при Президенте Республики Беларусь Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

Руска-беларускі слоўнік юрыдычных тэрмінаў, які будзе падрыхтаваны, забяспечыць тэрміналагічную аднастайнасць пры стварэнні нарматыўных прававых актаў, іх перакладзе з рускай мовы на беларускую, а таксама паспрыяе распаўсюджванню афіцыйнай прававой інфармацыі на беларускай мове ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт.

Слоўнік знойдзе прымяненне:

у заканадаўчай і заканатворчай дзейнасці, у рабоце органаў дзяржаўнага кіравання (Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь) і мясцовага кіравання (упраўленні, службы, структурныя падраздзяленні выканаўчых камітэтаў);

у далейшым вывучэнні юрыдычнай тэрмінасістэмы, канкрэтызацыі і ўдакладненні крыніц, шляхоў і спосабаў яе папаўнення, устанаўленні суадносін тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лексікі, тэрмінаў і наменклатурных назваў, даследаванні з'яў сінанімii, фармальнай і семантычнай варыянтнасці, аманімii, антанімii тэрмінаў, што станоўча паўплывае на развіццё тэорыі беларускага тэрміназнаўства;

у выкананні міждысцыплінарных праектаў;

у вучэбным працэсе: пры чытанні лекцый па сучаснай беларускай літаратурнай мове, пры правядзенні спецкурсаў і спецсемінараў па лексікалогii, лексікаграфii, тэрміналогii, тэрмінаграфii, стылістыцы ў вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь; пры выкладанні дысцыпліны "Беларуская мова: прафесійная лексіка"; пры напісанні курсавых, дыпломных,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

магістарскіх работ; пры стварэнні падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, практыкумаў, вучэбных праграм;

у лексікаграфічнай практыцы: пры ўкладанні і папаўненні двухмоўных (беларуска/рускіх, руска/беларускіх), тэрміналагічных, тлумачальных, энцыклапедычных слоўнікаў.

Слоўнік будзе садзейнічаць удасканаленню моўнай і маўленчай культуры носьбітаў беларускай мовы, што з'яўляецца актуальным ва ўмовах беларуска-рускага білінгвізму ў Беларусі.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Кулеш, Г. І. Актуальныя задачы лінгвістычнага забеспячэння парытэту беларускай і рускай моў у юрыдычнай сферы / Г. І. Кулеш // Беларускае слова: на хвалях часу : матэрыялы навук. чытанняў, прысвеч. памяці дац. І. М. Шчарбаковай, г. Мінск, 23 лют. 2022 г. / Бел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М. І. Свістунова (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2022. – С. 80–86.

